Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 17 1934 г. СЕРАДА № 13 (4846)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АДКРЫЦЦЁ 15 З'ЕЗДА КП(б)Б.

ПРАМОВА тав. ГІКАЛО.

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВ. ШАРАНГОВІЧА НА МЕНСКАЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ.

ЯКУБ КОЛАС — РЭФОРМА БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСА І ФАШЫСЦКІЯ МУЗЫКАНТЫ.

ШТО БЫЛО СНОМ, ТОЕ СТАЛА ЯВАЙ — ПІСЬМО НАРОДНАГА ПАЭТА БССР ЯНКІ КУПАЛЫ.

ЗА МЯЖОЙ.

Т. т. ДЗІМІТРАВУ, ТОРГЛЕРУ, ПАПОВУ І ТАНЕВУ ПАГРАЖАЕ ВЯЛІКАЯ НЕБЯСПЕКА.

ПАВЕТРАНАЯ КАТАСТРОФА ВА ФРАНЦЫІ.

СТАНОВІШЧА Ў ФУЦЗЯНЕ.

АДКРЫЦЦЕ XV З'ЕЗДА КП(б)Б

УЧОРА Ў 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА Ў ЗАЛЕ ДЗЯРЖАЎНАГА ЯУРЭЙСКАГА ТЭАТРА АДКРЫЎСЯ XV З'ЕЗД КП(б)Б

З'ЯЎЛЕННЕ ЗА СТАЛОМ ПРЭЗІДЫУМА ТАВ. ГІКАЛО ДЭЛЕГАТЫ СУСТРАКАЮЦЬ БУРНЫМІ АПЛАДЫСМЕНТАМІ

ПРАМОВА тав. ГІКАЛО

— Адкрыццё XV з'езда КП(б)Б, — пачынае сваю ўступную прамову т. ГІКАЛО, — супадае з важнейшымі гістарычнага значэння датамі — 10-годдзем смерці Леніна, пярэднем XVII з'езда партыі, 15-годдзем комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі і 15-годдзем стварэння Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

10 год таму назад памёр геніяльнейшы настаўнік, правадыр, арганізатар і стваральнік нашай большэвіцкай партыі, найвялікшы стратэг пролетарскай рэволюцыі, вечна жывучы ў сэрцах рабочых усяго света, і прыгнечаных народаў Усхода — Ленін.

Таварышы, прапаную ўшанаваць памяць вялікага правадыра і настаўніка ўставаннем.

(УСЕ ЎСТАЮЦЬ, АРКЕСТР ГРАЕ ЖАЛОБНЫ МАРШ).

Ленін пасля Маркса і Энгельса распрацаваў і даў рабочаму класу ўсяго света найвялікшую і вастрэйшую зброю ў барацьбе з капіталістычным светам — большэвіцкую партыю і вучэнне аб пролетарскай рэволюцыі і дыктатуры пролетарыята.

Праграма работ XVII з'езда партыі з'яўляецца трыумфам вялікага вучэння Маркса — Леніна — Сталіна.

Надыходзячы XVII з'езд ВКП(б), наперакор шалёнай злобе гінучага капіталістычнага света, наперакор супраціўленню класавых ворагаў нашай краіны і іх агентуры ў радах партыі — правых і «левых» апартуністаў, контррэволюцыйнага трацкізма — з'яўляецца лепшым доказам для працоўных усяго света, што рабочы клас не толькі руйнуе, але стварае лепшае, нечуванае ў параўнанні з капіталістычным светам.

XVII з'езд партыі з'яўляецца выражэннем волі рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных нашай вялікай Совецкай краіны, іх гераічнага падтрымання ў ажыццяўленні вялікіх ідэй Леніна, ідэй Сталіна ў справе пабудовы соцыялізма ў нашай краіне, у справе ператварэння нашай краіны ў аплот, у несакрушальную цвярдыню сусветнай пролетарскай рэволюцыі.

Таварышы, XVII з'езд з'явіцца дэманстрацыяй тых найвялікшых дасягненняў і перамог соцыялізма ў краіне Совецтаў, якія кожны край, вобласць, рэспубліка, кожная партыйная арганізацыя, кожны рабочы, кожны калгаснік з любоўю, з небывалым энтузіязмам і натхненнем пясе сваёй роднай большэвіцкай партыі ў асобе яе з'езда

***

Таварышы! Комуністычная партыя, рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Беларусі, адзначаючы супадзенне XV з'езда КП(б)Б з 15-годдзем першага з'езда КП(б)Б і стварэннем Беларускай Соцыялістычнай Совецкай Рэспублікі, падкрэсліваюць, што вучэнне Леніна аб пабудове соцыялізма, таксама як і ва ўсім Саюзе, ажыццяўляецца мільёнамі працоўных і ў Беларусі.

Вялікая ленінска-сталінская нацыянальная палітыка, дзякуючы няўхільнаму яе правядзенню ў Беларусі пры непасрэдным і прамым кіраўніцтве ленінскага ЦК ВКП(б) на чале з тав. СТАЛІНЫМ, пры актыўным падтрыманні працоўных Беларусі і пры дапамозе рабочых Совецкага Саюза прывяла Беларусь да росквіту, трыумфа беларускай культуры нацыянальнай па форме і пролетарскай па зместу.

На шляхах ліквідацыі фактычнай эканамічнай і культурнай адсталасці рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК дабіліся найвялікшых поспехаў. З краіны радней прыгнечанай і пазбаўленай паліцэйскім чынам і памешчыкамі, з краіны з адсталай сельскай гаспадаркай, з выключна слабай прамысловасцю, — Беларусь ператварылася ў краіну бурна-будуючагася соцыялізма, у краіну індустрыяльна-аграрную, у краіну суцэльнай граматнасці, у краіну высокай тэхнікі як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы.

Твар Беларусі, раней суцэльнай сялянскай, рамесніцкай, карчмарным чынам змянен. Палі Беларусі ўсеяны трактарамі, складанымі сельска-гаспадарчымі машынамі, у асаблівасці для апрацоўкі тэхнічных культур.

Гарады Беларусі ператварыліся ў цэнтры растучай беларускай совецкай культуры, у цэнтры навукі, у гарады буйнай прамысловасці. У рэзультаце няўхільнага штодзённага ажыццяўлення палітыкі партыі

ва ўсіх галінах нашай работы мы дабіліся буйных поспехаў.

Але мы адкрыта гаворым — нашы поспехі яшчэ недастатковы. Яны маглі быць яшчэ большымі, калі-б КП(б)Б, яе ЦК не дапусцілі раду памылак у сваёй практычнай рабоце, на якія ў свой час ленінскі ЦК ВКП(б) завастрыў увагу і дапамог нам іх выправіць.

Мы маем усе даныя для таго, каб канчаткова ліквідаваць якое-б там ні было адставанне па ўсіх участках практычнай работы, як у галіне сельскай гаспадаркі, у асаблівасці па ільназагатоўках, лесавывазцы, так і ў галіне прамысловасці, па ажыццяўленню задач партыі па выпуску лепшай якасці і ў большай колькасці тавараў шырокага ўжытку, а таксама ў галіне культурнай і ў справе далейшага паляпшэння матэрыяльна-бытавога становішча рабочых і калгаснікаў.

Мы маем усе даныя, і прайшоўшы 1933 год гэта пацвердзіў, што лозунг правадыра партыі тав. СТАЛІНА аб тым, каб зрабіць усе калгасы большэвіцкімі і калгаснікаў заможнымі, мы можам поўнасцю ажыццявіць. І мы абавязаны ажыццявіць яго ўжо ў бліжэйшыя гады другой пяцігодкі. Гэта тым больш неабходна, што БССР ужо сёння з'яўляецца несакрушальным фарпостам вялікага Совецкага Саюза на граніцы з капіталістычным светам.

Таварышы! Сёння адкрываюцца партыйныя канферэнцыі лепшых, перадавых большэвіцкіх арганізацый ВКП(б) — маскоўскай і ленінградскай.

Адсюль, з заходняй граніцы Совецкага Саюза, мы запэўняем перадавую маскоўскую арганізацыю, што ўзоры сапраўды большэвіцкай эператыўна-канкрэтнай работы, ажыццяўляемай ва ўсёй практычнай і палітычнай дзейнасці маскоўскай арганізацыяй, пад кіраўніцтвам аднаго з лепшых, вярнейшых саратнікаў тав. Сталіна — т. Кагановіча (АПЛАДЫСМЕНТЫ) узбройваюць большэвікоў Беларусі, натхняюць іх у іх складанай работе на граніцы з капіталістычным светам, з'яўляюцца прыкладам адданейшай, самаахвярнай практычнай барацьбы і работы за справу партыі, за справу Леніна, за справу Сталіна (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Ленінградскія большэвікі, большэвікі горада Леніна, першым падняўшага сцяг Окцябрскай рэволюцыі і яго ўтрымаўшага, пераможна ажыццяўляюць справу соцыялістычнай індустрыялізацыі, гіганцкі рухаюць наперад справу пролетарскай культуры. Іх работа для рабочых, калгаснікаў, комуністаў і комсамольцаў Беларусі з'яўляецца прыкладам у справе далейшай барацьбы за канчатковую перамогу сусветнай пролетарскай рэволюцыі (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Грандыёзныя перамогі, атрыманыя партыяй, рабочым класам, калгаснікамі ўсёй совецкай краіны, не гледзячы на велізарныя труднасці, перажытыя ў першую пяцігодку, з'яўляецца ажыццяўленнем вялікіх ідэалаў рабочага класа, гор да паднімаўшага сцяг соцыялізма на барыкадах Парыжа, Гамбурга, Кантона.

Сусветна-гістарычныя задачы другой пяцігодкі, ажыццяўленне якіх паднімае і ўзбройвае мільёны працоўных і прыгнечаных народаў усяго света на канчатковы штурм цвярдынь капіталізма — сёння ёсць не толькі справа рабочых, калгаснікаў і іх кіраўніцы — ВКП(б), але і ўсяго сусветнага пролетарыята.

Наперакор усякім апартуністам, не верачым у справу пабудовы соцыялізма ў адной краіне, — Совецкі Саюз сёння з'яўляецца краінай бурна-будуючагася соцыялізма і стаў рашаючым участкам сусветнага пролетарскага фронта, яго непрыступнай крэпасцю ў барацьбе за соцыялізм, за комунізм, у сусветным маштабе (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Гэтых гіганцкіх поспехаў наш Совецкі Саюз дабіўся таму, што ён мае такую партыю, як наша большэвіцкая, ленінская партыя (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Гэтыя перамогі дасягнуты таму, што творцом, натхніцелем гэтай партыі з'яўляўся Ленін, што справу Леніна прадаўжае яго найвялікшы саратнік, яго вярнейшы і лепшы паслядоўца—мудрэйшы правадыр партыі большэвікоў—настаўнік і друг наш т. СТАЛІН (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Імя тав. СТАЛІНА стала сцягам няўхільнай барацьбы за справу соцыялізма, за справу комунізма.

Імя тав. Сталіна вымаўляецца з найвялікшай любоўю і натхненнем працоўнымі як вялікага Совецкага Саюза, так і працоўнымі і рабочымі ўсяго света.

Недарма сёння гавораць аб эпосе т. СТАЛІНА, аб эпосе, знамянуючай сабою практычнае ажыццяўленне найвялікшых ідэй Маркса — Энгельса — Леніна.

Тав. Сталін развіў марксіцка-ленінскае вучэнне аб пролетарскай дыктатуры. Тав. Сталін развіў вучэнне Леніна аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў нашай краіне і яго практычна ажыццяўляе.

Тав. Сталін развіў на гэтай аснове генеральны план паступлення соцыялізма на ўсяму фронту, навучыўшы партыю, як трэба перамагаць ворага на ўсіх участках гэтага соцыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Сталін развіў ленінскае вучэнне аб індустрыялізацыі, як умове перамогі соцыялізма ў нашай краіне.

Тав. Сталін унёс найкаштоўнейшы ўклад у марксіцка-ленінскую тэорыю, распрацаваў пытанне аб канкрэтных шляхах соцыялістычнай пераробкі сялянства пад кіраўніцтвам пролетарыята.

Тав. Сталін распрацаваў пытанне — і партыя пад яго кіраўніцтвам пераможна гэта ажыццяўляе — аб умовах і метадах калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класа на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Тав. Сталін развіў марксіцка-ленінскую тэорыю ў нацыянальна-таваніяльным пытанні, як частку агульнага пытання аб міжнароднай пролетарскай рэволюцыі.

Ён развіў вучэнне Леніна аб партыі і яе ролі ў сістэме пролетарскай дыктатуры, бліскуча распрацаваў стратэгію і тактыку пролетарскай партыі.

Развіў ленінскі аналіз соцыяльных і ідэйных карэнняў апартунізма, ускрыўшы асаблівасці яго праяўлення на розных этапах класавай барацьбы.

Тав. Сталін даў выразны аналіз барацьбы двух сістэм ва ўмовах усеагульнага крызіса капіталізма і нарастаючай міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, з ленінскай цвёрдасцю і непрымірымасцю кіраваў барацьбой на два фронты — супроць усялякіх праяўленняў апартунізма ўнутры партыі і Камінтэрна, супроць контррэволюцыйнага трацкізма і супроць правага апартунізма — гэтай галоўнай небяспекі на даным этапе.

Тав. Сталін узбагаціў рэволюцыйны метад марксізма-ленінізма — матэрыялістычную дыялектыку. Імя тав. Сталіна стаіць у радах вялікіх імён і тэарэтыкаў, правадыроў сусветнага пролетарыята — Маркса—Энгельса—Леніна.

Няхай жыве XV з'езд КП(б)Б!
Няхай жыве XVII з'езд ВКП(б)!
Няхай жыве ленінскі ЦК ВКП(б)!

«Са сцягам Леніна дабіліся мы рашаючых поспехаў у барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва. З гэтым-жа сцягам пераможам у пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце».

Няхай жыве ленінізм!

Няхай жыве наш СТАЛІН! (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Выгукі: «Няхай жыве тав. СТАЛІН!»

БУРНАЯ АВАЦЫЯ. ДЭЛЕГАТЫ ПЯЮЦЬ «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».

Новыя выгукі: «Няхай жыве ЦК КП(б)Б і яго лепшы кіраўнік тав. Гікало!», «Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало — арганізатарам соцыялістычных перамог у Беларусі!»

Тав. ГІКАЛО: На даручэнню пленума ЦК КП(б)Б абвяшчаю XV з'езд кампартыі большэвікоў Беларусі адкрытым.

(АПЛАДЫСМЕНТЫ, «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»).

КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ З'ЕЗДА

ПРЭЗІДЫУМ XV З'ЕЗДА КП(б)Б

1. ГІКАЛО
2. ШАРАНГОВІЧ
3. ЖАБРОЎСКІ
4. РЫСКІН
5. АНЦІПАЎ
6. САХАРАВА
7. ЛЫЧОЎ
8. ГАЛАДЗЕД
9. ЧАРВЯКОЎ
10. УБАРЭВІЧ
11. СМІРНОЎ
12. ЗАКОЎСКІ
13. КАРТУКОЎ
14. БЕНЕК
15. РАТНЕК
16. КОНІК
17. КАВАЛЬЧУК
18. БРАГІНСКІ
19. ХАЦКЕВІЧ
20. ЧАРНУШЭВІЧ
21. ГЕРЦОВІЧ
22. ГОРЫН
23. ЛЕЎКОЎ
24. КУДЗЕЛЬКА
25. ХАДАСЕВІЧ
26. СААК'ЯН
27. ДАНЕНКА
28. РУТЭНБУРГ
29. РУСАНАЎ
30. ЖУКАЎ
31. ШАФАРЭНКА
32. ЖУРАЎЛЁЎ
33. РАВІНСКІ
34. МІЛЕР
35. СОСКІН
36. ЧЭРНЫШОЎ
37. ТУРЛАЙ
38. КЛІМЧУК
39. БУРАЧЭЎСКІ
40. КРАЦЭР
41. ЛЕНЦНЕР
42. КОРЧЫК
43. КІРЫЛАЎ
44. ВАЙНЕР
44. БАЛЫЧЭНКА
46. СУПРУН
47. ПАДАРЫН
48. КРАНІВЕЦКІ
49. РУЛЕЎ
50. ВАЙМАН
51. БАНГАЙЦІС
52. МАЙСЕЁЎ
53. КРОЛЬ
54. РАЗУМАЎ
55. БУРАВА
56. ПОЛЯК
57. МАКЕЕЎ
58. МАСЕВІЧ
59. ІВАНОВА
60. ДЭЙЧ
61. НЕФЕДАЎ
62. ДОСІН
63. СЯРГЕЕЎ
64. МАЗУРАЎ
65. ПАРФЁНАВА
66. ЛЕФ
67. КАГАНОВА
68. ГЛАДЫШЭЎ
69. РАЗАНАВА
70. ХАЦЬКО
71. КРУЧКОЎ
72. КАГАН
73. ТРЫГУБАВА
74. СЕЛІЦКІ
75. ЦАЙЦ
76. САБАЛЕНКА
77. ВЕРАСКО

Сакратарыят

1. ПОССЕ
2. БАЛЦІН
3. СУХАНАВА
4. ГЕЎРАСЕЎ
5. ГАЛЕНКА
6. КЛІМКОВІЧ
7. АЎГУСТАЙЦІС
8. НІЗОЎЦЭЎ
9. ЮНГ
10. ВАСІЛЬКОЎСКІ
11. БАШМАЧНІКАЎ

ГАНАРОВЫ ПРЭЗІДЫУМ

1. СТАЛІН
2. МОЛАТАЎ
3. КАГАНОВІЧ
4. ВАРАШЫЛАЎ
5. КАЛІНІН
6. АНДРЭЕЎ
7. КУЙБЫШЭЎ
8. КАСІОР
9. ОРДЖАНІКІДЗЕ
10. РУДЗУТАК
11. КІРАЎ
12. ПОСТЫШЭЎ
13. МІКАЯН
14. ТЭЛЬМАН
15. ДЗІМІТРАЎ
16. ЛЕНСКІ

Склад мандатнай камісіі

1. ЗЛОТКІН
2. ПЫЖЫКАЎ
3. ПАСЮКЕВІЧ
4. РЭЗНІКАЎ
5. КІШТЫМАЎ
6. ЖУКАЎ
7. ПЛАЎНІК
8. НЕСЦЕРАЎ
9. ДАМБРОЎСКІ
10. НОВІКАЎ
11. КАМАРОЎ
12. ПАЎЛАЎ
13. ПЛЕШАКОЎ
14. СНЕДЗЕ
15. ШАРАЎ
16. АЛКСНІС

Рэдакцыйная камісія

1. ТАМАРКІН
2. ХЕЙФЕЦ
3. ГЕРШОН
4. ЧОРНЫ
5. ВІГДАРОВІЧ
6. ЧЫЖОВА
7. ВАЛКІН
8. КАРБОЎСКІ
9. ГАЙДУКЕВІЧ
10. АЙВАЗАЎ
11. КАМЕНШТЭЙН

У ПРЭЗІДЫУМЕ XV З'ЕЗДА КП(б)Б.

ДЗЕННІК З'ЕЗДА

6 гадзін вечара. Зала «Дома культуры» пераапоўнена. Партэр і ложы заняты дэлегатамі. У першых радах — дэлегацыі буйных прамысловых цэнтраў і перадавых сельска-гаспадарчых раёнаў Менска, Віцебска, Гомеля, Барысава, Сянно, Полацка, Дрысы і інш.

З глыбіні азаронай чырвоным светам сцэны выпукляюцца бюсты Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна. Электрычныя надпісы «17» і «15» гараць па баках сцэны, а наверсе — вялізарны плакат:

«Са сцягам Леніна перамагалі мы ў баях за Окцябрскую рэволюцыю. Са сцягам Леніна дабіліся мы рашаючых поспехаў у барацьбе за перамогу соцыялістычнага будаўніцтва. З гэтым-жа сцягам пераможам у пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце. Няхай жыве ленінізм!» (Сталін).

Звонка пасецца песня. Дэлегаты спяюць разам з духавым аркестрам папулярную партызанскую:

«Ю дсцінаэ, по загор'ям шла дивизия вперед...»

Раптам песня абрываецца. За сталом прэзідыума паяўляецца першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало. Дэлегаты стоячы сустракаюць кіраўніка большэвікоў Беларусі гучнымі, доўга незмаўкаючымі апладысментамі, пераходзячымі ў авацыю.

У зале становішча ціха.

Тав. Гікало пачынае сваю ўступную прамову.

Канец прамовы тав. Гікало пакрываецца бурнымі апладысментамі.

Па даручэнню ЦК КП(б)Б т. Гікало абвяшчае XV з'езд КП(б)Б адкрытым.

Дэлегаты ўстаюць, аркестр грае «Інтэрнацыянал». Тав. Хадасевіч ад імя дэлегацый Менска, Гомеля, Віцебска, Магілева, Бабруйска, Оршы, Полацка і Дрысы прапануе выбраць прэзідыум з 77 чалавек.

Прапануецца выбраць ганаровы прэзідыум. Прапанова выбраць першым у склад ганаровага прэзідыума т. Сталіна пакрываецца гучнымі, доўга незмаўкаючымі апладысментамі ўсёй залы. Дэлегаты ўстаюць, паладжваюць любімаму правадыру сусветнага пролетарыята бурную авацыю. Усе зала пяе «Інтэрнацыянал».

Пад гром апладысментаў усіх дэлегатаў у ганаровы прэзідыум усходзіць за тав. Сталіным выбіраюцца тт. Молатаў, Каганові́ч, Калінін, Варашылаў, Андрэяў, Куйбышэў, Касіор, Орджанікідзе, Рудзутак, Кіраў, Постышаў, Мікаян, Тэльман, Дзімітраў і Ленскі.

Зноў гучныя воплескі і крыкі «ўра» раздаюцца пры аднадушным выбранні т. Сталіна ганаровым старшынёй XV з'езда КП(б)Б.

«Няхай жыве правадыр сусветнай рэволюцыі!», «Няхай жыве наш любімы Сталін!»—раздаецца ў зале пры аталашанні тэксту прывітальнай тэлеграмы тав. Сталіну.

Па прапанове т. Жураўлёва выбіраецца мандатная камісія, сакратарыят і рэдакцыйная камісія.

З'езд зацвярджае парадак дня, пасля чаго слова для даклада аб 15-годдзі 1-га з'езда КП(б)Б і БССР атрымаў спатканы бурнымі апладысментамі сакратар ЦК КП(б)Б т. Шаранговіч.

Пасля даклада т. Шаранговіча з'езд ад імя стотысячнай камсамольскай арміі і паўтарамільённай рабочай і калгаснай моладзі вітаў сакратар ЦК ЛКСМБ т. Герцовіч.

Тав. Герцовіч у сваёй гарачай прамове запэўніў XV з'езд і ў яго асобе ўсю парторганізацыю Беларусі, што комсамольская арганізацыя і моладзь будзе лепшым памочнікам КП(б)Б у яе барацьбе за генеральную лінію партыі, за пабудову соцыялізма ў нашай краіне.

З бразгатлівым боем, пад гукі фанфар, прыходзіць вітаць з'езд прадстаўнікі трохгадзь пакалення — піонеры. Рэпастайнымі транспарантамі яны дэманструюць перад з'ездам свае дасягненні ў вучобе, па авалоданню тэхнікай ва ўмацаванні абароназдольнасці краіны, дэманструюць сваё весёлае піонерскае жыццё.

Пад гукі песні і марша прыходзіць вітаць з'езд дэлегацыі вайсковых частак менскага гарнізона і патрэбнікаў. Іх сустракаюць дэлегаты з'езда крыкамі «ўра» і воклічамі: «Няхай жыве наша слаўная Чырвоная армія і яе правадыр т. Варашылаў!»

З'езд таксама віталі прадстаўнікі завода імя Варашылава, фабрыкі «Комунарка». З'езд заслухаў рашэнні дэлегацыі жанчын — калгаспніцаў-ударніц Сеншанскага раёна аб перамогах, заваяваных імі на фронце барацьбы за лён, аб шляху, пройдзеным за адзін год ад чорнай да чырвонай дошкі, да заваявання пераходнага чырвонага сцяга ЦК КП(б)Б.

У часе работы з'езда на «Доме культуры» адбылася вялікая мясавая дэманстрацыя працоўных горада Менска. Ад імя з'езда дэманстрацыю віталі тт. Рыскін, Жаброўскі і інш.

Пролетарыі Менска дэманстравалі сваю адданасць партыі Леніна, сваю гатоўнасць да далейшай упартай барацьбы пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б за выкананне задач другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бяспракласнага соцыялістычнага грамадства.

КП(б)Б У БАРАЦЬБЕ ЗА ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Артыкул першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Н. Ф. ГІКАЛО

К XVII з'езду ВКП(б) КП(б)Б ідзе згуртаваны маналітны калонай. Пабольшэвіку ажыццяўляючы дырэктывы ленінскага ЦК ВКП(б) і указанні правадыра партыі т. СТАЛІНА. Камуністычная партыя Беларусі, як неадрыўная частка вялікай ВКП(б), дасягнула велізарных поспехаў на ўсіх участках разгорнутага сацыялістычнага наступлення.

Ажыццяўленне ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, энтузіязм рабочых і калгасных мас у барацьбе за справу пабудовы сацыялізма ў БССР, брацкая дапамога рабочага класа Савецкага Саюза і ў асаблівасці штодзённае кіраўніцтва ЦК ВКП(б) і правадыра партыі т. Сталіна, забяспечылі карэннае змяненне твару Беларусі—былой калоніі царскай Расіі.

Вось некалькі характэрных лічбаў. Валавая прадукцыя прамысловасці БССР у 1930 г. выражаецца ў 1.030 млн. руб., а ў 1913 г. усл прадукцыя прамысловасці Беларусі складала толькі 100 млн. руб.

На месцы старых халуп—саматужных майстэрань з сярэдневяковым абсталяваннем волай пролетарыята, кіруемага нашай партыяй, створаны буйныя фабрыкі і заводы, абсталяваныя па апошняму слову тэхнікі, маючыя агульнасаюзнае значэнне. Такія прадпрыемствы, як Магілёўская фабрыка штучнага шоўку, гомельскі механічны шклянны завод імя Сталіна, віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», рабочая электрычная станцыя імя Сталіна, якая абслугоўвае сваёй энергіяй прамысловасць 3-х буйнейшых пэнтраў Беларусі, дзесяткі іншых буйных фабрык і заводаў—усе гэтыя прадпрыемствы створаны насілі рэволюцыі сіламі рабочага класа і працоўных мас сялянства.

Яшчэ больш здзіўляючыя паказальнікі роста электрыфікацыі. Калі ў 1913 г. магутнасць усіх электрастанцый Беларусі складала, прыкладна, 5 тыс. кілават, дык ужо ў 1927 г. гэта магутнасць дасягнула 14,4 т. кілават, а ў 1933 годзе электраўзброенасць БССР дасягае 70 тыс. клв.

У 1913 г. на ўсіх прадпрыемствах Беларусі налічвалася не больш 13.000 рабочых: зараз у прамысловасці Беларусі занята каля 114 тыс. рабочых. Той факт, што ў складзе рабочага класа 62 проц. займаюць рабочыя беларусы, з усёй відавочнасцю сведчыць аб росце нацыянальных кадраў з мясцовага карэннага насельніцтва.

На базе індустрыялізацыі БССР рэзка змяніўся твар сельскай гаспадаркі Беларусі. 52 проц. бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак рэспублікі аб'ядналіся ў калгасы. Сацыялістычны сектар сельскай гаспадаркі—соўгасы і калгасы—займаюць 80 проц. усіх зямельных угоддзяў Беларусі. Значна вырасла пасеўная плошча.

У беларускай вёсцы да рэволюцыі жалезны плуг і барана былі слабыткам кулацтва. Беднякі і сераднякі апрацоўвалі свае вузкія жабрацкія палоскі дзеравянай сахой і бараной з яловых сукоў. Гэтыя ўбогія «сродкі вытворчасці» складалі тую «самабытнасць», якую ўсхваляла беларуская контрэволюцыйная нацдэмаўшчына.

У гэту вёску прышлі 63 МТС, якія маюць 1.727 трактараў, што складае прыблізна палову ўсёй колькасці трактараў, якія працуюць на шляхах Беларусі. У вёску ўлілася аграмадная колькасць сельска-гаспадарчых машын, вызваляючых калгаснікаў ад непасільнай, змарваючай працы.

Лозунг т. СТАЛІНА аб тым, каб зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі, пранік у самую шырэкую гушчу працоўных калгасных мас. Гэты лозунг падняў вытворчую і палітычную актыўнасць беларускай калгаснай вёскі і прывёў да рашучага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, да значнага ўздыму матэрыяльна-бытавога добрабыту калгаснікаў. У гэтым годзе калгаснікі Беларусі атрымалі на працадзень у сярэднім па 3--3½ кгр. збожжавых і 8-10 кгр. бульбы супроць 1-1½ кгр. збожжавых і 3-4 кгр. бульбы ў мінулым годзе. У гэтымжа годзе тысячы калгаснікаў атрымалі на працадзень 7-8 кгр. зерневых і да пуда бульбы.

Развіцё сацыялістычнай эканомікі ў Беларусі забяспечыла апшведныя поспехі і на культурным фронце. Калі звярнуцца да лічбаў, характарызуючых будаўніцтва сацыялістычнай культуры, дык яны прадстаўляюцца ў наступным выглядзе: у 1913 г. у Беларусі налічвалася да 70 проц. непісьменнага насельніцтва, а ў 1932 г. у БССР ПОЎНАСЦЮ ЛІКВІДАВАНА НЕПІСЬМЕННАСЦЬ і ўведзена ўсеагульнае пачатковае навучанне.

У 1913 г. на тэрыторыі Беларусі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы. У 1933 г. у Беларусі налічваюцца дзесяткі ВНУ і ВТНУ і больш 100 тэхнікумаў.

Шырока разгарнулася сетка масавых школ: беларускіх, яўрэйскіх, польскіх, рускіх. Зараз у БССР ёсць 7.131 школа. З гэтай колькасці беларускіх школ—6384.

У Беларусі разгарнула вялікую работу Акадэмія Навук з вялікай колькасцю навукова-даследчых інстытутаў па раду галін навукі і тэхнікі. У Беларусі выраслі кадры совецкіх беларускіх вучоных. Сярод іх — буйныя вучоныя з асяродзіча рабочых і калгаснікаў, на пісаўныя рад сур'ёзных прац па самых розпастайных галінах навукі.

Поспехі КП(б)Б у галіне развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі з'яўляюцца яркім паказальнікам трыумфа ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР.

Трэба мець на ўвазе, што нацыянальная палітыка партыі заключаецца не толькі ў мерапрыемствах культурнага парадку, якія ідуць па лініі правядзення беларусізацыі, па лініі стварэння беларускіх школ, выпуску беларускіх кніг, распрацоўкі мовы, нацыянальная палітыка прадстаўляе суму мерапрыемстваў, накіраваных на знішчэнне фактычнай, г. зн. гаспадарчай і культурнай няроўнасці нацыянальнасцяй Саюза рэспублік.

Яшчэ на XII з'ездзе партыі тав. Сталін з усёй сілай падкрэсліў значэнне барацьбы за ліквідацыю фактычнай няроўнасці паміж раней панаваўшай нацыяй і раней прыгнечанай нацыяй.

«Неабходна, — гаварыў тав. Сталін, — каб апрача школ і мовы, расійскі пролетарыят прыняў усе меры к таму, каб на акраінах, у адстаўных у культурных адносінах рэспубліках — а адсталі яны не па сваёй віне, а таму, што іх разглядалі раней, як крыніцы сыравіны — неабходна дабіцца таго, каб у гэтых рэспубліках былі пабудаваны ачагі прамысловасці».

Велізарны рост прамысловасці, уздым сельскай гаспадаркі і культуры ў БССР за гады рэволюцыі сведчыць аб тым, што працоўныя Совецкай Беларусі дабіліся, пры брацкім шчырым падтрыманні з боку Совецкага Саюза, найвялікшых поспехаў у справе будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зместу.

У асаблівасці трэба падкрэсліць той факт, што ТЭМПЫ РАЗВІЦЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ПА БССР ЗА ПЯЦІГОДКУ БЫЛИ ЗНАЧНА ВЫШЭЙШЫЯ, ЧЫМ ПА САЮЗУ Ў ЦЭЛЫМ. Калі па Саюзу ў цэлым штогодні прырост прамысловай прадукцыі за пяцігодку складаў у сярэднім 21,6 проц., дык па БССР гэты сярэдні штогодні прырост складаў 48 проц. (па прадпрыемствах 4-х наркаматаў).

Вось вам яркая ілюстрацыя трыумфа ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай да ліквідацыі фактычнай няроўнасці паміж нацыямі.

Поспехі БССР асабліва рэльефна вырысоўваюцца на фоне эканамічнага крызіса і заняпаду гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі, якая знаходзіцца пад ярмом польскага фашызма.

У БССР — трыумф, росквіт сацыялістычнай эканомікі і пролетарскай культуры, рост матэрыяльнага добрабыта шырокіх працоўных мас.

У Заходняй Беларусі — крызіс, збяднение, галеча. Пролетарыят і шырокія працоўныя масы сялянства асуджаны на марудное і пакутнае выміранне.

XVII з'езд ВКП(б) і XV з'езд КП(б)Б партыйныя арганізацыі Беларусі сустракаюць радам буйных перамог у практычным правядзенні генеральнай лініі партыі. У гэтым годзе ў Беларусі раней па тэрмінах і лепш па якасці быў праведзен амаль увесь цыкл сельскагаспадарчых работ гэтага года. Хлебапастаўкі, адгрузка бульбы пролетарскім пэнтрам выкананы ў тэрмін і поўнасцю.

Нашы памылкі і недахопы своечасова адзначаліся ЦК ВКП(б) і т. СТАЛІНЫМ. Дзякуючы гэтаму нам удавалася правільна мабілізаваць усю партыйную арганізацыю і шырокія працоўныя масы на хуткую ліквідацыю памылак і недахопаў у нашай рабоце.

Яшчэ на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК ВКП(б) т. Сталін падкрэсліў, што рост матутнасці совецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленне паміраючых класаў. «Іменна таму, што яны паміраюць і дажываюць апошнія дні, яны будуць пераходзіць ад адных форм паскокаў да другіх больш розных форм паскокаў, апелюючы да адсталых слаёў насельніцтва і мабілізуючых іх супроць совецкай улады... На гэтай глебе могуць зашавяліцца разбітыя групы старых контррэволюцыйных партый, эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтра і акраін, могуць ажыць і зашавяліцца асколкі контррэволюцыйных апазіцыйных элементаў з трацкістаў і правых апартуністаў. Гэта, вядома, не страшна. Але ўсё гэта трэба мець на ўвазе, калі мы хочам пакончыць з гэтымі элементамі хутка і без асаблівых ахвяр».

Факты актывізацыі класава-чужых, нацыяналістычных, апартуністычных, трацкісцкіх і іншых антысовецкіх элементаў у Беларусі з усёй відавочнасцю пацвярджаюць правільнасць гэтага геніяльна-глыбокага аналіза, данага т. Сталіным.

Яшчэ ў мінулым годзе па пытаннях ходу загатовак у Беларусі і па справе пастаўкі Сцяпуры, якога праследавалі мясцовыя нацыяналісты за карыстанне рускай мовай у быту, ЦК ВКП(б) вынес канкрэтнае рашэнне, ускрываючае сутнасць і характар намылак КП(б)Б у практычным правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

ЦК ВКП(б) тады з усёй рашучасцю падкрэсліў наяўнасць у КП(б)Б гніла-ліберальных адносін да класава-чужых нацдэмаўскіх элементаў, якія зачастую прыкрываліся партбілетам і праводзілі сваю антысовецкую работу пад фальшыва-нацыянальным сцягам. Больш таго, ЦК указаў, што ў Беларусі няма дастатковай большэвіцкай барацьбы за правядзенне ас поўных прынцыпаў пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Пасля рашэння аб ходзе загатовак і па справе Сцяпуры КП(б)Б правяла вялікую работу ў галіне выкрыцця і разгрому нацыяналістычных элементаў.

КП(б)Б, як неадрыўная арганічная частка вялікай ВКП(б), расла і загартоўвалася ў барацьбе з ухіламі ад генеральнай лініі партыі, ад ленінскай нацыянальнай палітыкі. Класавы вораг, выбіваемы са сваіх пазіцый, усімі сіламі імкнуўся і імкнецца аказаць шалёнае супраціўленне разгорнутаму наступленню сацыялізма па ўсяму фронту.

У 1933 г. у Наркамаземе, у Наркамземе, Акадэміі Навук было ўскрыта шкодніцтва і астаткі нацдэмаўскіх уплываў. У Наркамземе да апошняга часу пралезшыя ў апарат контррэволюцыйныя нацыяналістычныя элементы па заданню ім перыялістычных інтэрвентаў прадаўжалі праводзіць разбітую партыяй палітыку былога наркамзема Прышчэпава, палітыку насаджэння кулацкіх хутароў і рэстаўрацыі капіталізма.

У Наркамасветы нацдэмаўскае ахвосце працягвала ў падручніках і праз школы сваю контррэволюцыйную ідэалогію, расстаўляла на розных участках культурнага фронту свае сілы.

За апошні год таксама пачасцілася выпадкі вылазак нацыяналістычных элементаў у літаратуры, тэатры і т. д.

Цяпер даволі выяўлена, што рад былых лідэраў нацыянал-апартуніз ма ў Беларусі (Ігнатоўкі і інш.) былі прамымі агентамі контрразведак некаторых капіталістычных дзяржаў. Паміж нацыянал-апартуністамі і контррэволюцыйнымі нацыянал-дэмакратамі была самая цесная ідэйная і бытавая сувязь. Стварыўся, такім чынам, адзіны фронт нацыянал-апартуністаў, нацыянал-дэмакратаў, шпіёнаў, накіраваны супроць совецкай улады, супроць большэвікоў.

Таксама як і на Украіне, перакідваліся агенты польскай дэфензывы (Гаўрылюк, Дварчанін, Мятла, Рак-Міхайлоўскі, Бурсевіч і інш.), якія імкнуліся тут, у БССР, стварыць контррэволюцыйныя нацыянал-дэмакратычны пэнтр з мэтай звяржэння совецкай улады і ператварэння Беларусі ў калонію заходня-еўрапейскіх імперыялістаў.

Паказанні ўдзельнікаў гэтых контррэволюцыйных груповак гаворяць, якія шырокія планы будаваліся контррэволюцыянерамі, беларускімі нацыяналістамі, якія прадаліся замежным памешчыкам і капіталістам.

Аказалася, што ўсл гэта зграя яшчэ задоўга да прыходу фашызма да ўлады мела непасрэдную сувязь з нямецкімі фашыстамі, мела даволі дэтальна распрацаваную антысовецкую праграму дзеянняў. Гэтым контррэволюцыянерам удалося самкнуцца з унутранымі ворагамі, праслешымі і папаўшымі нават у рады партыі, а ў некаторых выпадках нават на кіруючыя адказныя партыйныя пасты.

Вось чаму задача своечасовага ўскрыцця новых манеўраў класавага ворага ў такім пытанні, як нацыянальнае, дзе зараз адбываецца змыканне беларускіх нацыяналістаў і вялікарускіх шавіністаў, падтрымліваемых усёй контррэволюцыяй, у тым ліку і трацкістамі, набывае асабліва важнае палітычнае значэнне.

Не выпадкова пленум ЦК КП(б)Б, абмяркоўваючы пытанні, звязаныя з правядзеннем ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, прыйшоў да тых-жа вываду, што і пленум ЦК КП(б) Украіны, а іменна, што ва ўмовах Беларусі мясцовы беларускі нацыяналізм з'яўляецца ў дадны момант галоўнай небяспекай у галіне нацыянальнага пытання.

Праведзеная чыстка з усёй наглядпасцю паказала, як класавы вораг, прабраўшыся ў КП(б)Б, у блоку з апартуністамі ўсіх масцей тармазіў, а ў некаторых звеннях нават зрываў выкананне задач, якія сталіць перад партарганізацыяй.

Чыстка рашуча ўдарыла па астатках сямейнасці, груповушчыны і месніцтва, якія меліся ў КП(б)Б. Чыстка дапамагла партарганізацыі і яе кіраўніцтву вылзіць новыя кадры большэвіцкага актыва, згуртаваць яго вакол ЦК для далейшай яшчэ больш настыховай барацьбы за чоткае своечасовае выкананне ўказанняў ЦК ВКП(б) і правадыра партыі і сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІНА.

Заваз КП(б)Б, значна ачысціўшыся ад класавых ворагаў пролетарыята і нашай партыі, больш уз мацніўся, загартавалася, што знаходзіць сваё выяўленне ва ўсё больш паспяховым выкананні чарговых задач КП(б)Б, у барацьбе за генеральную лінію партыі.

Асноўнай і важнейшай задачай КП(б)Б, з якою яна прыходзіць да свайго XV з'езда, з'яўляецца далейшая барацьба за поўнае выкананне ўсіх нашых гаспадарча-палітычных кампаній. Калі ўспць - работу прамысловасці, дык трэба адкрыта сказаць, што на працягу апошніх двух год яна не выходзіць з палясы сур'ёзнага адставання. Невыкананне промфінплана жаптуе дзесяткі мільёнаў рублёў нашай пролетарскай дзяржаве. Асноўнай прычынай невыканання промфінплана з'яўляецца неканкрэтнасць, дэкларацыйнасць у сістэме кіраўніцтва прамысловасцю. Партыйныя ячэйкі і профсаюзы ў сваёй практычнай рабоце ксіска праводзяць 6 гістарычных указанняў т. Сталіна — ас нову барацьбы за промфінплан.

Рад новых фабрык і заводаў, набудаваных у першай пяцігодцы, яшчэ не працуюць па поўную сваю магутнасць. Гэта тлумачыцца выключна тым, што комуністы не аўладалі тэхнікай, не паставілі ў цэнтры задачу асваення тэхнікі новых прадпрыемстваў.

Асабліва важнай задачай КП(б)Б з'яўляецца далейшая барацьба за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, за поўнае выкананне лозунга т. Сталіна — зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі. Перад намі таксама стаіць задача — рашуча палепшыць работу соўгасаў і асабліва жывёлагадоўчых. У гэтых адносінах намі шмат што зроблена мала, а магчымасці ў нас велізарныя.

БССР яшчэ не выканала сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай па злачы ільнагалакна. Пакуль яшчэ ніска выконваюцца пастановы ЦК аб ліквідацыі бескаровасці. Беларусь займае таксама адно з апошніх месц і ў справе рамонту трактараў. Апошні пленум ЦК КП(б)Б прыняў рад канкрэтных рашучых мер, якія, безумоўна, павінны забяспечыць поўнасцю і з'ездам партыі выкананне гэтых задач.

Далейшае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі ставіць перад КП(б)Б задачу рашучай барацьбы за бальшэвіцкі інтэрнацыяналізм ва ўсёй нашай рабоце.

Мы ні ў якай меры не можам спыніцца на дасягнутых поспехах. Росквіт нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры высоўвае перад намі задачу палепшэння ўсёй нашай работы па ўсіх без выключэння звеннях нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Рашаючым звяном у барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку з'яўляецца праблема далейшага вырошчвання новых большэвіцкі-праверацых пролетарскіх кадраў з нацыянальнасцяй карэннага насельніцтва і ў першую чаргу з ліку беларусаў. У гэтых адносінах праведзена ўжо вялікая работа. Але трэба сказаць, што яна яшчэ яўна недастаткова. Палепшэнне работы навучэбных арганізацый, органаў Наркамасветы, палепшэнне работы тэатраў, кіно і т. д. — усё гэта настойна патрабуе ад нас падрыхтоўкі большэвіцкі-вытрыманых, праверацых кадраў.

КП(б)Б к свайму XV з'езду і XVII з'езду ВКП(б) прыходзіць з велізарнейшымі дасягненнямі ва ўсіх без выключэння галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта акалічнасць высоўвае перад намі задачу рашуча і хутка ліквідаваць тыя недахопы, якія яшчэ ёсць у нашай рабоце. Для іх ліквідацыі ў нас ёсць усе ўмовы.

Разгортваючы большэвіцкую крытыку і самакрытыку, рашуча выкарчоўваючы слюнтяйства, мяшчанства, якія яшчэ маюць месца ў паасобных звеннях КП(б)Б, рашуча ажыццяўляючы слаўсена - дэкларацыйныя адносіны да правядзення генеральнай лініі нашай партыі, перамагаючы кацыялістска-бюракратычныя метады кіраўніцтва, мы здолеем забяспечыць у нашай рабоце большэвіцкую эфектыўнасць, канкрэтнасць. На аснове правільнай расстаноўкі людзей і сапраўднага знання справы ва ўсіх звеннях партыйных, совецкіх і гаспадарчых органаў мы здолеем хутка ліквідаваць нашы недахопы.

Асноўнай зарукай да гэтага з'яўляецца далейшая, яшчэ больш непрымірымая барацьба за генеральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку. КП(б)Б яшчэ вышэй падыме сваю рэволюцыйную пільнасць, яшчэ больш згуртуе свае рады вакол ленінскага ЦК і правадыра партыі т. СТАЛІНА.

ПЕРАДРУКАВАНА З „ПРАВДЫ" ад 16 студзеня

Рэформа беларускага правапіса і фашысцкія музыканты

Якуб Колас

Уступіўшы ў свой беларускай пролетарскай культуры мы можам адзначыць дуже пышныя не момант—рэформу беларускага правапіса. Рэформа гэта санкцыянавана пастановай СНК БССР ад 15-IX—33 г. Той жывы, гарачы вецер, якім сустрэла беларуская совецкая грамадскасць рэформу правапісу, сведчыць аб значнасці і правільнасці яе вырашэння.

Рэформа беларускага правапіса мае за сабою хвосты багатую і складную гісторыю. Бурны рост і развіццё беларускай пролетарскай культуры на аснове ленінскай нацыянальнай, беларускага пісьменства ў шырокім значэнні гэтага разумення, патрабавала ў нядоўгі час, далёка перарасці тыя арфаграфічныя рамкі, якія былі ажачаны яшчэ ў 1917 годзе Б. Тарашкевічам. Совецкая Беларусь за якіх-небудзь 15-16 год сваёго існавання будаўніцтва рэшыла так далёка наперад, дабіцца такіх велізарных вынікаў, такіх культурных здабыткаў, якіх яшчэ не, вядае гісторыя. Давоіі сказаць, што Совецкая Беларусь, былая калонія царскага імперыялізма, прыгнёсная, забітая, каланіяльная, намаганнямі нашых і совецкай улады, пры ма тутнай дапамозе другіх братніх совецкіх рэспублік, ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну з высокім развіццём тэхнікі, з густой сеткай начальных, сярэдніх і вышэйшых школ, з сотнямі тэхнікумаў розных спецыяльнасцяй, з дасяткамі вышэйшых спецыяльных і навуковых устаноў на чале з Беларускай Акадэміяй Навук, поўнасцю ліквідаваўшы непісьменнасць шырокіх працоўных мас, каб мець удзелне ў тым, якія здобыткі культурныя здабыткі Совецкай Беларусі за гэты час! Гэты бурны і далёкі ростаў культурнага будаўніцтва не мог не адбіцца на росце і развіцці самой беларускай мовы, мовы рабочых і калгасных мас працоўнага сялянства. Беларуская мова ўзбагацілася прыгожам тысяч новых тэрмінаў, новых разуменняў, якія ўносіліся і ўносяцца працэсам культурнага будаўніцтва на аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі. Тая вузкая лексічная основа, основа пораваньна сялянскай, кулацка-шляхецкай лексікі, на якой пачала разгортвацца беларуская пісьменнасць, які літаратура, аказалася занадта вузкаю і цеснаю для жывога арганізма сучаснай беларускай мовы, мовы працоўных мас і ўлада сымагала свайго пашырэння, патрабавала смелай прагрэсіўнай рэформы. Гэта акалічнасць настойліва ставіла ў парадак дня пытанне аб рэформе беларускага правапіса.

Рэформай беларускага правапіса на працягу цэлых год займаліся людзі, якім партыя і совецкая ўлада даверылі гэты важны і адказны ўчастак культурнага фронту, як фронт мовы. Лёсік, Ластоўскі, Некрашэвіч і да іх падобныя, засеўшы ў совецкіх культурна-асветных установах, захапіўшы манаполію на частцы стварэння беларускай кніжнай мовы, рабілі контррэволюцыйную шкодніцкую справу. Але контрольная выкрыла іх контррэволюцыйны твар, расшыфравала іх рэдакцыйныя установкі, накіраваныя на рэстаўрацыю капіталістычнага ладу, на інтэрвенцыю, на адрыў Совецкай Беларусі, як мыпой, арганічна ўзросшай адсюль, у жывы арганізм вялікага Саюза ССР, на стварэнне кулацка-шляхецкай Беларусі пад крылцамі польскага фашысцкага бела рада.

Беларуская мова ў руках гэтых рэстаўратараў рэакцыі і прынечання, сацыяльнай і нацыянальнай няволі беларускіх працоўных мас стала галоўнай базавой пазіцыяй, з якой і вялі яны свае атакі супроць дыктатуры пролетарыята, блакуючыся з розными антырэволюцыйнымі групоўкамі ўнутры Совецкай Беларусі і змыкаючыся з прадстаўнікамі замежных контррэволюцыянераў і шпіёнаў. Ацэнка іхняй работы ў гэтым плане дана ў пастанове СНК БССР «Аб эменах і спрашчэнні беларускага правапіса».

«Нацыянал-дэмакратызм, — гаворыцца ў пастанове, — імкнуўся ўсімі мерамі і спосабамі адарваць беларускую літаратурную мову ад мовы шырокіх беларускіх працоўных мас, стварыць штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовай і за смечваць беларускую мову розными сярэдневяковымі архаізмамі і буржуазнымі вульгарызмамі». (Пастанова СНК БССР аб эменах і спрашчэнні беларускага правапіса).

Правільнасць такой характарыстыкі пацвярджаецца тысячамі фактаў і дакументаў, накінутых нацдэмамі. Аб гэтым сведчыць нацдэмаўская літаратура, слоўнікі, граматыкі, так званыя навуковыя доследы з жыцця розных святых, з рэакцыйнай тлені мінулага для таго, каб ушырэдзіць рэакцыйную тлень сучаснага. Гэтыя людзі, стоячы на пазіцыях змяркання старога света, варожа паставіўшыся да дыктатуры пролетарыята, тужыліся ажывіць, палянць з трупы мерцвяка, сярэдневяковую беларускую мову і самабытнасць, імкнуліся зрабіць гэта ў сваіх рэакцыйных і контррэволюцыйных мэтах. Шмат праектаў рэформы беларускага правапіса засталося пасля нацдэмаў. Усе гэтыя праекты не вы ходзілі з цеснай, заскарузлай шкарлупіны нацдэмаўскай канцэпцыі і яшчэ больш заблытвалі правапіс, рабілі яго яшчэ больш рэакцыйным. І арэвумела, не яны здольны былі правесці рэформу беларускай арфаграфіі ў інтарэсах совецкіх школ і шырокай пролетарскай грамадскасці. Гэту рэформу правяла смелая, рашучая большэвіцкая рука, рука дыктатуры пролетарыята. Інакш і быць не магло: рэакцыйны па сваёй прыродзе, з'яўляецца зброяй змагання супроць дыктатуры пролетарыята, супроць навукі і прагрэса. Праваніф-ка ў руках дыктатуры пролетарыята ёсць магутная зброя за культурны рост працоўных мас, за навуку, за прагрэс, за сацыялістычнае будаўніцтва, за інтэрнацыянальнае выхаванне, за непарыўную сувязь усіх народаў Совецкага Саюза. У гэтым заключаецца тлыбокі палітычны сэнс рэформы беларускага правапіса, рэформы, праведзенай пастановай СНК БССР.

У тым жывым, актыўным і гарачым вецеру на рэформу беларускага правапіса, якім сустрэла яе беларуская пісьменніцкая грамадскасць саюза совецкіх пісьменнікаў, дана ёй ацэнка. Выказванні пісьменнікаў з повану рэформы правапіса выходзяць асобнаю кніжкаю, а таму я не буду спыняцца тут на гэтай ацэнцы.

Калі совецкая грамадскасць БССР горача адгукнулася на рэформу правапіса, то фашысцкі беларускі друк ушыў гэту рэформу ў штыхі, узняў вялікі яе шалёную палітычную агітацыю, накіраваўшы яе супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць Совецтаў. У гэтым аркестры злобных галасоў беларускіх фашыстаў розных масцей і афарбовак чуюцца галасы і прадстаўнікоў польскай віленскай прэсы. Прыбым далучэнне галасоў гэтых палітычных прайдох здзяўляцца ў поўную сугучнасць з галасамі беларускіх фашысцкіх музыкантаў, падпарадкоўчыся дырыжорскай палачцы прабелага кампазітара інтэрвенцыяністкай музыкі. У «Кур'еры Віленскім» № 397 ад 15-XI—1933 г. аўтар замет кі «Беларускае пытанне ў СССР»—імя якога пад заметкаю не значыцца—«шляхетны» і «тонкі» палітык. Ён лірычна станавіцца ў позу чалавека, які дужа спачувае беларусам, асабліва нашым, совецкім, на якіх «сыплюцца ўдар за ўдарам». Піша ён у такім тоне, што яго, балай можна прыняць за «шчырага беларуса». Ён прызнае неабходнасць рэформы беларускага правапіса. Ен піша так:

«Бясспрэчна, неабходнасць рэформы беларускага правапіса паспела. Написаная былым правадыром Грама ды Б. Тарашкевічам граматыка патрабуе перапрацоўкі і асчысткі ад непатрэбнага балясу. Быць можа паступіцца ў БССР пры сваёй школьнай рабоце больш за другіх адчувала неабходнасць удасканалення роднага правапіса. Быць можа дасягалі галасы, трабаваўшыя гэтага. І вось 15-IX—г. г. з'яўляецца дэкрэт аб рэформе правапіса».

І трохі далей гаворыць, прычым тон яго набывае яшчэ большую лірычнасць:

«Несумненна, для беларусоў прыказ (падкрэслена мною—Я. К.) СНК гэта балючы ўдар. Этнаграфічная Беларусь, разадзеленая Рыжскім трактатам на дзве палавіны, сёння адчувае новы падзел. (Чуеце, якая мо спачування!—Я. К.). Бо, не гледзячы на пагранічныя слупы, да гэтага часу беларусы і з таго і з другога боку граніцы мелі агульную мову, агульны правапіс».

Вось як хораша і з якім спачуваннем піша пан, не ведаю, як зваць яго, з «Кур'ера Віленскага». Ну, чым не «шчыры» беларус? Успомнім нават: Рыжскі трактат і пагранічныя слупы. Лірычная эмацыянальнасць яго тону была-б яшчэ больш акругленай і поўнай іграла-б шмат мацнейшым акордам, калі-б лірычны пан з «Кур'ера Віленскага» ладаў сюды, што беларускія школы па той бок пагранічных слупоў разгромлены польскім фашызмам, што беларускія дзеці палазяць у польскіх школах, што на іх балюкоў накладаецца там штрафы за сказанае ў школе роднае слова, што само беларускае насельніцтва шмат якіх паветаў Заходняй Беларусі, прыдушанае ненамерным падаткамі, хранічна галадае, што лепшыя сыны беларускага народу, змагары за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, загнаны ў падполле або тэмяцца ў польскіх астрогах, што на гарадах лютуе беспрацоўе, што калі каго Мацыеўскім работы хоць адбаўляй. Але лірычны спачувальнік беларускаму народу дыпламатычна не гаворыць пра гэта.

Хто-ж, канкрэтна, прымае ўдзел у гэтай, як гаворыць пан, «не вялікай, але бардзо пожыўнай кампаніі», у гэтым аркестры фашысцкіх музыкантаў, атраднічаў беларускіх працоўных мас, прадаўшых за панскія срэбранікі іх інтарэсы, іх нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне? Тут сышліся «Родны край», «Беларуская крыніца», «Кур'ер Беларускі», «Пшэгляд Віленскі» і прадстаўнікі «Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні» у асобах старшыні Пожэнка, першага яго-старшыні Н-і (ледзь не Ну-і з Манжуры)—Я. К.), В. Баглановіча, Ф. Ярэміча, А. Клімовіча, Старобіча, Кулякага і сакратара (прозвішча не значыцца — Я. К.). Як бачым, сакрэтары кампаніі не вялика, але «бардзо пожыўна». Усё гэта людзі, аддадзеныя свайму народу і прадаўшыя яго інтарэсы за панскія срэбранікі польскаму фашызму. Гэта купцы і падрадчыкі па частцы партаў інтэрвенцыяністкай літаратуры, палітычных авантурнікаў і шпіёнаў, якіх шталт Гаўрылюкоў, Валышоў, Ужаў-Міхайлоўскіх, Мётлаў і іншых. Пад навіною шыляцца культурніцтва, ідзяючыся дымымі фразамі, гулякчы ў апазіцыю з польскай уладай, яны, гэтыя культуртэгі, сакрэтары аператыны беларускага народу, яго нацыянальных (праумей—рэакцыйных, кулацка-шляхецкіх) інтарэсаў, усю сваю дзейнасць накіроўваюць на тое, каб прытушыць, аслабіць інстынкт палітычнага змагання працоўных мас Заходняй Беларусі за свае нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, каб адарваць іх ад уплыва, які мае на іх компартыя Заходняй Беларусі, каб дыскрэдытаваць у вачох працоўных мас, ленінскую нацыянальную палітыку, не жыве якой будуецца сацыялістычная культура і добрабыт працоўных мас Совецкай Беларусі.

Яны сваёмага дапамагаюць польскаму фашызму задушыць вызваленчы рух паняволенага народу. Усе іх пасляцкія рэчы, да ў шчыкі нам капітане з кіраўнікамі органа ні польскай улады. Ад гэтых свяцчыць адзіноцтва, нарэшце, гэтых порадаў працоўных беларускіх мас, дзе яны, гэтыя ідэалогі прайдоні, і спекулянты, хочуць гаворыць аб спосабах, як дасягнуць класавую пільнасць працоўных мас, каб групкі дзеяць [illegible] і задмецкаму фашызму. [illegible] вожная дасягнення Совецкай Беларусі ў галіне культуры нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу выкідаюць іх з поглядзі і кідае ў стан шчыру і [illegible] супроць дыктатуры пролетарыята.

Гэтым і тлумачыцца тое злоснае шыпенне, тое жывае [illegible], якое пачынае [illegible] супроць рэформы беларускага правапіса. Але [illegible] іх патуг: моцна [illegible] ідэе дзяржаўнага [illegible] [illegible] Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік над мурыцы [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] пролетарыята тав. Сталіным.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ШАРАНГОВІЧА
НА МЕНСКАЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

На раніцнім пасяджэнні канферэнцыі 14 студзеня выступілі гутньмі выказваннямі з прамовай выступіў тав. ШАРАНГОВІЧ.

—Наша партыя,—гаворыць т. Шаранговіч,—падыходзіць да свайго XVII партз'езда як ніколі згуртаваным атрадам вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і свайго правадыра і настаўніка тав. СТАЛІНА. Апублікаваныя парадак дня з'езда і тэзісы выклікалі небывалую хвалю ўздыму актыўнасці рабочых, калгаснікаў і працоўных мас Савецкага Саюза. Гэта пажвае, паколькі вялікі аўтарытэт нашай партыі сярод працоўных. Дасягнутыя перамогі ў выкананні першай пяцігодкі далі магчымасць памножыць праграму пятгарычных задач, вызначаных у тэзісах т. т. Молатава і Куйбышава, задач набліжэння бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Пераходзячы тэзісы мы павінны ўвязваць сёння з канкрэтнай работай кожнага звяна партыйнай арганізацыі.

Адзначаючы поспехі ў рабоце Менскай партарганізацыі, тав. Шаранговіч увязвае гэта з большэвізацыяй партыйных арганізацый, праведзенай пры новым кіраўніцтве ЦК КП(б)Б. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б), пры непасрэдных указаннях тав. Сталіна, на падставе пастаноў ЦК ВКП(б) аб загатоўках 1932 года, па справе Снятурго і інш., — гаворыць тав. Шаранговіч, — разгарнуўшы большэвіцкую самакрытыку, за апошнія гады мы прайшлі вялікую школу большэвізацыі радоў КП(б)Б. Мы спач па ўсяй шырокай партарганізацыі, дабіліся несумненных поспехаў у рабоце. ЦК нанёс сакрушальны ўдар па тых элементах, якія гнілаліберальна адносіліся да выканання ленінскага пастаўлення. Я маю на ўвазе атаку з работы Рафальскага, Грысевіча, Платуна, Цэйцлера і іншых. Мы правялі вялікую шырокавуючую работу ад імя мас з ворагамі элементаў па культурным фронце, на гістарычным фронце і разам другіх участкаў.

Мы падыходзім да XV з'езда КП(б)Б як школі згуртаванай і дабіліся рада буйнейшых перамог на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва, умацавання дыктатуры пролетарыята, у ажыццяўленні ленінскай нацыянальнай, нанеслі сакрушальны ўдар па класова-варожых антысавецкіх элементах.

Чыстка рацэў КП(б)Б, праведзеная на высокім палітычным узроўні, пры самакрытыцы большэвіцкай самакрытыцы, дазваляла КП(б)Б ачысціць рады ад прымакаўшыхся, чужых, перарадзіўшыхся і другіх ніцкіх элементаў. Чыстка значна больш згуртавала рады КП(б)Б і ўзняла яе мабілізаванасць на выкананне чарговых задач.

Але мы зрабілі-б вялікую памылку, калі-б заканчаліся гэтымі поспехамі і перамогамі і пачалі забываць аб тых вялікіх недахопах і прарывах, якія ёсць у нашай рабоце. Той, хто лічыць, што мы сапраўды ўжо ва ўсёй КП(б)Б і яе ЦК, у кожным звяне партарганізацыі, у тым ліку і Менскай партарганізацыі, перабудавалі так работу, што яна адказвае ўзрослым запатрабаванням сучаснага перыяду, — той глыбока памыляецца і займаецца зазнайствам.

Мы зрабілі толькі першыя крокі ў перабудове нашай работы.

У нас вялікія недахопы ў галіне барацьбы за выкананне прамфінплана і лёгкай і лёгкай харчовай і саматужнай прамысловасці. Менск не выканаў праграмы першага і другога года пяцігодкі, толькі 86 проц. выканана фігуруе ў справаздачы гаркома. За гэта адставанне трэба вельмі моцна, па-большэвіцку крытыкаваць.

У галіне паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў рабочых мы працуем дрэнна, мы маем немала фактаў бюрократычных адносін да гэтай задачы.

Мы павінны пакланяцца аб тым, каб кватэра рабочага была чыстай, культурнай кватэрай, каб прадпрыемствы, цэхі былі чыстымі, каб у больніцах было добрае і ўважлівае абслугоўванне, каб была чыстая сталоўка, мелася палева для рабочых і ўсямерна ўмацнялася харчовая база прадпрыемстваў.

Тав. Шаранговіч падвяргае крытыцы бяздзейнасць рада цэнтральных арганізацый і недастатковую ўвагу гаркома да пытанняў забеспячэння Менску апалам. Мы мелі ўсе магчымасці, каб Менск быў забяспечан дровамі, але людзі, якія павінны непасрэдна займацца гэтай справай, драмалі ў шашку тады, калі з усёй энергіяй трэба было клапаціцца аб завозе дроў. Мы маем шэраг буйных недахопаў і на другіх участках работы (сельская гаспадарка, культурнае будаўніцтва і інш.).

Далей тав. Шаранговіч спыняецца на хотэе спрэчак па дакладу ЦК КП(б)Б і гаркома.

— Я лічу,—гаворыць тав. Шаранговіч,—што выступленні рада таварышоў у сэнсе крытыкі недахопаў работы нашых апаратаў недастатковыя. У гэтай крытыцы няма неабходнага рэзкага большэвіцкага агню.

Менская партарганізацыя безумоўна з'яўляецца перадавым атрадам КП(б)Б, на яе ўскладаецца вялікая адказная задача — быць узорам для ўсёй КП(б)Б. Вядома, Менская партарганізацыя па радзе ўчасткаў работы з'яўляецца перадавой у КП(б)Б. Але гэтага мала. Мы ўправе патрабаваць, каб яна была ўзорнай, па рабоце якой-бы вучыліся другія атрады КП(б)Б, у першую чаргу ад Менскай партарганізацыі.

Ахарактарызаваўшы задачы ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў сувязі з рашэннем 9-га пленума ЦК КП(б)Б і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, тав. Шаранговіч завастрае ўвагу партканферэнцыі на пытаннях перабудовы работы партыйных, совецкіх, прафсаюзных арганізацый у адпаведнасці з тэзісамі па дакладу тав. Кагановіча, якія з'яўляюцца ключам для выканання гістарычных задач намечаных у тэзісах к XVII з'езду па дакладу т. т. Молатава і Куйбышава, падвергаючы крытыцы дрэнную перабудову совецкіх прафсаюзных і іншых арганізацый.

Мы павінны дабіцца значна большага павышэння рэволюцыйнай пільнасці кожнага камуніста, кожнай партыйнай арганізацыі, бо наша далейшая барацьба за ажыццяўленне гістарычных задач другой пяцігодкі будзе праходзіць ва ўмовах жорсткай класавай барацьбы. Выкарчоўванне капіталістычных элементаў будзе суправаджацца вялікае супраціўленне. Паміраючыя класы будуць стараццa рабіць усё тое, каб падарваць нашу работу, падарваць паспяховы ход нашага соцбудаўніцтва.

Мы не сумняваемся, што Менская партыйная арганізацыя ўспрымае ў сваёй рабоце сапраўды ленінска-сталінскі стыль, возьме пад жорсткі кантроль праверку выканання сваіх дырэктыў.

На XV-м з'ездзе КП(б)Б мы павінны паставіць задачу вывесці нашу рэспубліку ў рады ўзорных перадавых рэспублік СССР вартую ўзнагароджання ордэнам Леніна. За ажыццяўленне гэтай задачы павінна змагацца па-большэвіцку кожная партарганізацыя, кожнае пізавое звяно.

Мы павінны дабіцца таго, каб ў рэспубліцы не было ні аднаго адсталага раёна, ні адной адсталай партыйнай арганізацыі. Мы гэта павінны ажыццявіць не на словах, а на справе, і гэтым самым пакажам, што працуючы на граніцы ў складаных умовах з'яўляемся вартым перадавым атрадам усёй ВКП(б) па-большэвіцку мабілізуючым сябе на практычнае ажыццяўленне дырэктыў і ўказанняў ленінскага ЦК ВКП(б) і правадыра нашай партыі тав. Сталіна, на выкананне гістарычных задач, якія намечаны ў тэзісах т. т. Молатава, Куйбышава і Кагановіча па XVII з'езда ВКП(б).

СЛОВА ДЭЛЕГАТАМ XV З'ЕЗДА КП(б)Б

ПЕРШЫЯ ЗРУХІ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАМОГА

ІОФФЕ

Сакратар партячэйкі цэха польтаў фабрыкі „Профінтэрн", дэлегат XV з'езда КП(б)Б

Наша фабрыка ў мінулым годзе, асабліва ў першым паўгоддзі, працавала з ганебнымі прарывамі. На дзесяткі тысяч рублёў мы не дадалі прадукцыі пролетарскай дзяржаве за 1933 год. Бяч нашай вытворчасці — гэта была непэкая якасць прадукцыі. Брак даходзіў да 5-8 проц. замест 1 проц. па плану.

ЦК КП(б)Б вынес спецыяльна па нашай фабрыцы пастанову, якая з'явілася для нас гістарычным дакументам, баявой праграмай перабудовы ўсёй работы на фабрыцы.

Мы ўзяліся за перабудову работы як па вытворчай, так і па партыйнай лініі.

Наша фабрыка працуе ў дзве змены. Пры старой сістэме арганізацыі вытворчасці калі першая змена канчала сваю работу, то яе поўфабрыкаты заставаліся на істужцы. Другая змена прадаўжала работу над гэтымі незакончанымі вырабамі. Такая форма арганізацыі работы не давала магчымасці выявіць сапраўдных бракаробаў, стварала абязлічку, не забяспечвала сапраўднага гаспадарчага разрахунку. Незакончаная вытворчасць даходзіла да аграмадных размераў. Цэхі і рабочыя месцы былі завалены поўфабрыкатамі і т. д.

Мы ўвялі новую так званую з'ёмачную сістэму работы. Пры скончэнні свайго рабочага дня кожная змена знімае свае незакончаныя поўфабрыкаты з істужкі.

Пры такой сістэме арганізацыі вытворчасці кожная змена працуе ад пачатку да канца над фабрыкатам, адказвае за яго якасць, за хуткасць яго апрацоўкі. Вось калі, напрыклад, істужкавы майстар не здолеў арганізаваць так справу, каб істужка змена ўпажылася ў нарматывы незавершанай вытворчасці, то склад яму не адпусціць сыравіны.

Гэта дало магчымасць павысіць адказнасць істужкавых майстроў і ўсяго тэхперсанала, праводзіць сапраўдны гаспадарчы разрахунак, палепшыць якасць прадукцыі.

Мы таксама перабудавалі і партмасавую работу. Раней у нас былі змяншаныя партыйныя ячэйкі. Аб'ектам увагі партыйнай ячэйкі была змена з розных вытворчых адзінак. Зараз мы арганізавалі цэхавыя ячэйкі. Партыйная ячэйка зараз абслугоўвае рабочых 1 цэха ў двух зменах. Істужкі маюць свае партгрупы. Безумоўна, такая арганізацыя больш забяспечвае партыйнае кіраўніцтва ўсім жыццём цэха.

Мы разгарнулі масавую работу асабліва па барацьбе за якасць нашай прадукцыі. Арганізавалі электрэфетафэр, палітсямейныя вечары. Лепшыя ударнікі запрашаюць да сябе ў госці бракаробаў і другіх ударнікаў. Там за чашкай чаю абмяркоўваюцца канкрэтныя пытанні вытворчасці, шкодкасць браку, шляхі яго знішчэння і т. д.

Перабудова вытворчай і палітмасавай работы, чыстка партыі значна актывізавалі наш рабочы калектыў і стварылі перапор у рабоце.

Ужо ў кастрычніку 1933 г. брак па нашай фабрыцы знізіўся да 0,99 проц., лісталаж — 0,55 проц., снежань — 0,23 проц. Пасобныя істужкі (1,13,14) зараз працуюць амаль зусім без браку.

Многія рабочыя, якія раней рабілі брак, пад уплывам партмасавай работы кінулі яго рабіць і працуюць зараз добра (рабочыя Дубман, Зайцаў і інш.). Істужкі паміж сабою замкнулі соцумовы на лепшыя паказальнікі работы, разгортваецца інды відуальнае спаборніцтва і ўдарніцтва. У цэху польтаў, дзе я працую сакратаром парт'ячэйкі, з 570 рабочых і служачых ахоплена індывідуальнай соцумовай 400 чалавек, ёсць 370 ударнікаў.

Значна павысілася роля камуніста на вытворчасці. Вось работніца Велюга (кандыдат партыі) за адно паўгоддзе здолела павысіць сваю кваліфікацыю з 3-га да 6 разраду.

Старая работніца РУЧАНКА 5-га разраду сістэматычна перавыконвае сваю норму (110-115 проц.), узяла шэфства над комсамолкай ГАРЭЛІК.

Але, безумоўна, у нас яшчэ шмат недахопаў у рабоце і промфінплан яшчэ на 100 проц. не выконваецца. Значныя тормазы ствараюць перабоі ў снабжэнні нас электраэнергіяй. Толькі за адну палову снежня месяца (1933 г.) мы страцілі 34 проц. нашага рабочага часу, а бывалі дні, калі працавалі па адной гадзіне.

Але галоўнае не ў гэтым, а ў тым, што партарганізацыя нашай фабрыкі яшчэ не праляміла рашэнне ЦК ва ўсіх звеннях вытворчай і масавай работы нашай фабрыкі. Вось за першую дэкаду студзеня забеспячэнне электраэнергіяй было куды лепшае, некаторыя цэхі выканалі свае заданне (цэх польтаў — 101 проц., брак—0,06 проц.), а па ўсёй фабрыцы промфінплан за гэты час выкананы на 98 проц.

Мы слаба разгортваем тэхвучобу. З 1.700 рабочых і служачых на нашай фабрыцы ўсімі відамі тэхвучобы ахоплена 310 чалавек. Вопыт лепшых — яшчэ не стаў здабыткам асатняй масы рабочых.

Праводзячы мяне на XV з'езд на шай партыі, рабочыя фабрыкі абяцалі ў бліжэйшыя дні забяспечыць рашучы пералом, каб з гонарам выканаць план другога года другой пяцігодкі.

НАБЛІЖАЕМСЯ ДА АСВАЕННЯ ПОЎНАЙ МАГУТНАСЦІ ПЕРШАЙ СІСТЭМЫ

ШЭЛІХІН А.

Сакратар парткалектыва шклозавода імя Сталіна, дэлегат XV з'езда КП(б)Б

Шклозавод імя Сталіна—тонар нашай краіны. Ён механізаван паводле апошняга слова тэхнікі. Зусім зразумела таму адказнасць партыйнай арганізацыі за яго асваенне.

Тры месяцы, якія прайшлі з дня пуску завода, гэта тры месяцы ўпартай барацьбы з «дзіцячымі хваробамі» пускавога перыяду.

Зрывала работу газагенератарная станцыя. Дрэннае аўладанне шураўшчыкамі працэсу работы, слабае паступленне торфу з завода «Большэвік»—асноўныя прычыны ненармальнай падачы газу ў печы і каналы «Фурко», а адсюль —зрыў выканання плана. Партарганізацыя ў першую чаргу звярнула на гэта ўвагу, тым больш, што шураўшчыкі ў асноўным—маладыя рабочыя, толькі што прышоўшыя з вёскі. Арганізавалі кароткатэрміновыя курсы. Пачалі сістэматычна праводзіць з імі работу. Зменны інжынер КУЗЬМІН тут аса бліва актыўна сябе праявіў. Для забеспячэння лепшай падачы торфу паслалі на торфазавод праверанага камуніста СІРЫДЗЕНКА, умацавалі людзьмі прыёмачную пры шклозаводзе. У выніку—вось ужо больш тыдня як мы не ведаем недахвату ў апале. Значна палепшылася таксама падача газу ў машына-ванны цэх. Ліквідаваны ў асноўным перабоі і хістанні тэмпературы газу.

Усё гэта спрыяла таму, што, прыклална, з 3-га студзеня былі ўсяго 1-2 выпадкі абрыву істужак шкла, або, як кажуць, адно-два падзенні машын. А зусім-жа нядаўна іх было сотні ў дзень. Праўда, не малая работа была праведзена і ў самым машына-ванным цэху—асноўным цэху, дзе скансэнтравана складаная тэхніка і па віне якога абрывы былі таксама не адзінкавымі выпадкамі. Члены партыі ІВАНОВА (зменны інжынер), САЛАЎЁЎ (майстар), можна сказаць, не вылазілі з цэха, вывучаючы прычыны абрываў. Па кожнаму выпадку збіралі змены, выяўлялі вінаватых, абгаварвалі, як трэба працаваць, каб папярэджваць абрывы. Рэзультаты відавочны. Аб іх я ўжо сказаў. Зараз пры цэху арганізаван гурток тэхмінімума на 60 чалавек. Рыхтуюцца фуркісты для другой сістэмы завода, якая ўвойдзе ў эксплаатацыю ў гэтым квартале.

У апошнія 10 дзён завод атрымаў яшчэ адну перамогу ў аўладанні тэхнікай: 6 машын з 12-ці пачалі цягнуць ардынарнае (самае тонкае, прадугледжанае праектам) шкло. Гэта мы лічым асноўным у асваенні завода.

У пачатку вялікі бой шкла давалі адбортаўшчыкі і адломшчыкі. Звярнулі мы ўвагу на гэты ўчастак. Разгарнулі масавую работу. Давалі тэхнічныя ўказанні. Зрыў дабіліся. Бою стала менш прогнатаў на 50, але ўсё яшчэ работы па канчатковаму знішчэнню бою асталося не мала. Узоры барацьбы за аўладанне тэхнікай паказвае адбартоўшчыца, член партыі тав. ПАЧАКАЕВА. Пры яе дапамозе прышла ў рады перадавых таксама адборшчыца тав. ГОЛІКАВА.

Зараз самым балючым месцам на заводзе з'яўляецца работа разгрузчага цэха. Ён нядаўна закончан будаўніцтвам, і ўсяго тыдзень як пачалі збіраліся сюды рабочыя. Пераход не быў як належыць падрыхтован. І ў рэзультаце зараз ёсць труднасці: не наладжана транспартавання шкла з машына-ваннага цэха (з трох пагёмак працуе толькі адна), не асвоены паваротныя кругі і інш. Усё гэта прывяло да таго, што разны цэх не паспявае своечасова прапускаць тую колькасць шкла, якая паступае з машына-ваннага цэха. Зараз асноўная ўвага партарганізацыі звернута на поўнае асваенне гэтага цэха.

Так, коратка гаворачы, стаіць у нас справа з аўладаннем тэхнікай, з асваеннем завода. Задачы ўскладняцца ў сувязі з пускам другой сістэмы завода. Зараз фактычна 1 эксплаатацыі палова завода—12 машын сістэмы «Фурко». Такая-жа колькасць увойдзе ў строй праз паўтара-два месяцы.

Перад партарганізацыяй стаіць адказнейшая задача—так падрыхтавацца да пуску другой сістэмы завода, каб на вопыце недахопаў пускавога перыяда першай сістэмы з самаго пачатку поўнасцю асвоіць праектную магутнасць.

Соцыялістычная праца перавыхоўвае людзей

ПАЎЛАВА МАРЫЯ

Парторг 1-й ленты цэха па пашыўцы штаноў швэйнай фабрыкі „Сяг індустрыялізацыі", дэлегат XV з'езда КП(б)Б

Пасобныя цэхі нашай фабрыкі ў свой час да таго кепска працавалі, што Наркам лёгкай прому СССР прышлося вынесці пастанову аб закрыцці цэха чаліто.

Работай фабрыкі займаўся і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, які даў нам практычную праграму дзеяння. Непатрэбная мітынгоўшчына, шуміха былі заменены канкрэтнай барацьбой за план, за якасць прадукцыі.

Інакш пайшла работа. Пачалі выяўляцца лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы. Яны паказвалі прыклады ў рабоце, дапаматалі адстаючым. Кваліфікаваныя работніцы бралі шэфства над новымі.

Напрыклад, да нас прышла вясковая дзяўчына НЕБЫВАЛАВА Даша. На механізмы ленты яна глядзела азвіўлёнымі вачыма. Брыгадзір ЭНДУС МАРЫЯ і я ўзялі на сябе абавязацельства навучыць яе працаваць. Не пазнаць зараз Дашу. Яна выпускае за змену 330 адзінак замест планавых 320. На яе аперацыі няма браку.

Кепска работала і КРАЕЎСКАЯ. Яна часта спазнялася на работу. Вывучаць аперацыі Краеўская ўпарта адмаўлялася. На яе аперацыі было многа завалаў. Па яе віне затрымлівалася работа нашай ленты. Аб яе бяздзейнасці гаварылі на кожным пасяджэнні, сходзе ленты.

Гэта падзейнічала на Краеўскую. Яна пачынае прасіць майстра тав. КРАПЧАН навучыць яе працаваць. Майстар згадзіўся.

Краеўская ўпарта вывучала тэхніку вытворчасці, пачала прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ленты. Зараз яна ўжо ведае 10 аперацый. Норму яна перавыконвае штодзённа на 40 адзінак.

Гэта адзін з прыкладаў таго, як упарта займаемся мы перабоўкай псіхалогіі людзей, нядаўна прышлых на вытворчасць. Нядаўна работніцы нашай ленты ўнеслі прапову працаваць на фабрыцы поўных 8 гадзін. Сем гадзін непасрэдна па вытворчасці, а 8-ую гадзіну аддаць на тэхнічнае навучанне рабочых і работніц.

Зараз у сувязі з падрыхтоўкай да з'ездаў партыі ленты абвясцілі конкурс на атрыманне права прысвоіць ленце імя тав. Сталіна. Гэта дало нам магчымасць з першыя дзён 1934 года выконваць вытворчую праграму.

Пасылаючы мяне дэлегаткай на XV з'езд партыі, работніцы прасілі перадаць, што план першай ленты цэха па пашыўцы штаноў будзе сістэматычна перавыконвацца, брак будзе даведзен да нуля.

ЗМАГАЦЦА ЗА ПЯРШЫНСТВА

МЕРСОН ГАЛЯ

Работніца панчошнай фабрыкі „КІМ"

Я дэлегат XV з'езда КП(б)Б. А ў 1931 годзе, калі я ўступіла ў партыю, я была маланісьменнай. Пачала працаваць пад сабой, пад аўладаннем тэхнікай. Дапамога з боку парткалектыва фабрыкі дала мне магчымасць хутка стаць прыкладным членам партыі і лепшай ударніцай.

Я працую ў КРАСІЛЬНА-АПАРАТУРНЫМ ЦЭХУ. Наш цэх рапаючы. Тут праходзіць апошні працэс апрацоўкі. Адсюль прадукцыя ўжо ідзе непасрэдна да спажыўца. Патрэбна вялікая ўвага рабочых, каб не выпусціць з фабрыкі ні аднаго бракаванага камплекта. Але ўвесь мінулы год мы працавалі дрэнна. промфінплан выканалі толькі на 89 проц.

Адставанне тлумачыцца тым, што рабочы калектыў поўнасцю не аўладаў тэхнікай вытворчасці. На ша фабрыка абсталявана навейшымі машынамі, а значная колькасць рабочых—гэта людзі, нядаўна прышоўшыя на прадпрыемствы. Нажаль, кіраўніцтва фабрыкі гэтага не ўлічыла, яно займалася разважаннямі аб «недахопах рабочай сілы». За апошні час работа значна палепшылася.

Комуніст на вытворчасці павінен быць лепшым ударнікам Гэта добра ўсвядомілі рабочыя партыйны красільна-апаратурнага цэха. Такія комуністы, як кантралёр якасці КОФМАН і складчыца СМОЛЬСКАЯ сваім прыкладам спрыяюць агульнаму ўзняццю вытворчасці. Яны першыя аўладалі тэхнікай і сістэматычна перавыконваюць свой промфінплан.

У сувязі з падрыхтоўкай да XV З'ЕЗДА КП(б)Б і XVII З'ЕЗДА ВКП(б) шырока разгарнулася на фабрыцы соцспаборніцтва і ўдарніцтва за высокія паказальнікі выканання вытворчай праграмы, за лепшую якасць выпускаемай прадукцыі. У выніку за першую палову студзеня фабрыка выканала промфінплан на 102 проц. Гэта сведчыць аб поўнай магчымасці выканання промфінплана пры ўмове шырока разгорнутай масава-растлумачальнай работы і ўдарніцтва не па словах, а на справе.

Перад намі стаіць цэлы рад задач па выкананню планаў другога года другой пяцігодкі. Яшчэ больш згуртаваўшыся вакол ЛЕНІНСКАГА ЦК і нашага любімага правадыра тав. СТАЛІНА, мы з патроенай энергіяй будзем змагацца за перадавое месца сярод прадпрыемстваў лёгкай індустрыі.

ШТО БЫЛО СНОМ, ТОЕ СТАЛА ЯВАЙ

Пісьмо народнага паэта БССР Янкі Купалы

Лечачыся на сонечным Каўказе, у Кісловодску, я дазнаўся з газет аб той ашчэннай гітлераўскай кампаніі, якую ўчынілі ў Заходняй Беларусі пацыянал-фашысты з прычыны рэформы беларускага правапісу, увядзенага ў жыццё урадам Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Кампанія гэта нам зразумела, бо гэту рэформу запрэдзіў совецкі ўрад, за гэту рэформу стаяла наша большэвіцкая партыя, гэтай рэформы жадала совецкая грамадскасць, рабочыя, калгаснікі, пісьменнікі, вучоныя і т. д.

Сёння мы шапрэсодні вялікіх урачыстасцей — XV гадавіны БССР і XV з'езда нашай слаўнай пераможнай комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі.

Асірыўшыся ясным поглядам і ўгледаўшыся шчырай душой на прошлыя гэтыя 15 год, мы бачым тых, — сядзалася-б нешасных — дасягні мы, прамах у вялікім соцыялістычным будаўніцтве: што было снам, тое стала явай, што было казкай, тое стала рэчаіснасцю.

Там, дзе на вялікіх абшарах Беларусі сцуўся «лапцюжны» пад «крывуткі» сахой, — вамна шахцяжаюць тысячы трактараў, там, дзе дымілася цвяткоўная лучына, яскрыць совецка электрычная лямпа, там, дзе ў саматкачай майстэрні вацкі пролетарый-рабочы, — вырасці новыя буйныя фабрыкі, узнялася на былых пустырах светлыя гігантызаводы. Учора пацяжэльны апрыблены рабочы і селяны-бядняк, сёння з высока падняты гаваой вольны грамадзянін і будаўнік вялікага Совецкага Саюза.

У размаху і вялікім соцыялістычнага будаўніцтва ўсе грамадзянскія дзейкі сурнасць соцыянальнай палітыкі нашай партыі.

Мы сёння з гордасцю назіраем і адчуваем вялікія дасягненні ў галіне культуры. Згрэць толькі на дзесяткі тысяч школ, дзе беларуская дзеці пазнаюць веды ў сваёй роднай мове, на дзесяткі вышэйшых навучальных устаноў, дзе тысячы пролетарскага студэнства пасягаюць самыя навейшыя здабыткі сусветнай навукі, згрэць на нашу Акадэмію Навук, якая з'яўляецца цэнтрам беларускай совецкай культуры, на дасягненні нашай жастацкай літаратуры, нашых тэатраў, нашай кінематаграфіі, на рост рабочых клубаў, на тысячы яслей і дзіцячых садоў, дзе гадуецца новае радаснае пакаленне і рыхтуецца стаць будаўнікамі разумнага і шчаслівага жыцця.

Вырасла і далей бурна расце індустрыяльна-калгасная Беларусь.

Вырасці і далей растуць і гартуюцца непераможныя будаўнікі бясклясавай соцыялістычнай грамады.

Гісторыя Совецкай Беларусі багата сваёй героікай штурма вышынь соцыялізма: гісторыя совецкай Беларусі чакае сваёй песні, свайго мастака, свайго гісторыка:

Прыйдзе пояты—а муцры гісторык,
А ён прыйдзе—ужо ён ідзе —
І сказ дзіўны, праўдзівы ад зорак,
І да зорак аб нашых прасторах
Аб падзеях, людзях павядзе.

Ён фажажа, як з творчым імкненнем
Для народаў закон выдавала
Большэвіцкая праўда, сумленне,
Каб жыццё ужо было без прыгнёту
І мінула праклящцяў навала.

Як змячаліся цвёрдай рукою
Пролетару варожыя класы,
Як на фронтах ішоў бой за боем,
Як зброд ворагаў здаўся, не ўстояў
У тыя грозныя бурныя часы.

Як ішла рэканструкцыя смела
Па заводах, па полі, па думках,
Перашкоды знішчаючы ўмела,
Хоць варожы табун адзічалы
Ён імшу пахавальную крумкаў.

Як мінулым спаганена праца
Ад батрацкай прыгонная сярмягі,
Сабе ўзносячы ў сонцах палацы,
Стала горда навек называцца
Справай гонару, славы, адвагі.

Маладому свайму пакаленню
Ён апіша з палётам арлінным,
Як блыскотна з бетону, з каменню,
З цэглы, з сталі, з жалеза —у праменнях
Тут за гмахам рос гмах на руінах

Як узняўшыеся слаўна ў вышыні
Соцспаборніцтва, ударніцтва ўдала
Злабывала багацці краіне,
Гарацы будавала ў пустынях
І пустынную ноч асвятляла.

Як за трактарам трактар выхоўіў
На сялянскія стужкі-палоскі,
Каб у дружным, як войска, пахоцце
Нішчыць межы-малыны заводзіць,
Будзіць спячыя сёлы і вёскі.

Як яна—большэвіцкая партыя,
Каб да тла зруйнаваць стары свет,
Барацьбою запятай, упартай,
Сваю ставячы голаў на карту,
Дасягла нечасцых пабед.

На аснове ўсіх нечуваных дасягненняў вырасла і адточваецца адзін з важнейшых сродкаў шартыі ў барацьбе за соцыялізм—беларуская мова.

Беларуская мова з пагардзанай і пацяжэльнай стала фоўнапраўнай і дзяржаўнай, як і мовы ўсіх народаў Совецкага Саюза.

Стары правапіс у якім не мала было засмечанасці, нацыянальскай «самабытнай» сохайчнасці,—трымаў беларускую мову ў палоне прэзіцыялізма, у рамках пацыяналістычнай абмежаванасці. Рэформа правапіса, праведзеная пазнанскай СНК БССР ад 26 жніўня 1933 г., мае велізарнае палітычнае і гістарычнае значэнне.

Рэформа правапіса, — што я мушу з усёй цвёрдасцю падкрэсліць,—з'яўляецца велізарным правільным і своечасовым актам барацьбы за культуру беларускай мовы па шляху пролетарскага інтэрнацыяналізма, пад сцягам якога толькі можа быць сапраўдны росквіт беларускай культуры, соцыялістычнай па зместу, нацыянальнай па форме.

Мяне зусім не дзівіць тое жыццё, якое пачала супроць гэтай так патрэбнай пастановы нашага ўрада непабітая нацдэмаўшчына ў БССР і разюшаная праця паслугачоў польска-нямецкага фашызма—нацыянал-фашыстаў Заходняй Беларусі.

Як нацдэмы тут, так і нацыянал-фашысты ў Заходняй Беларусі Луцкевічы, Станкевічы і т. д. служаць адзінай мэце—адарваць Совецкую Беларусь ад Совецкага Саюза і кінуць яе ў пазняволле —соцыяльнае, нацыянальнае і культурнае — пад ногі нямецкага, польскага, беларускага жандара, памешчыка-фашыста.

Гэта разюшаная антысавецкая брахня, падкрэтая злотымі і маркамі польска-нямецкай цыфензывы, разаб'ецца, як аб недаступную скалу, аб магутнасць і з'яднанасць рабочых і калгаснікаў Совецкай Беларусі, якія разам са сваёй роднай Чырвонай армяй грозна стаяць на варце захсднягa рубежа Совецкага Саюза.

Я з вялікім задавальненнем і радасцю прачытаў прынятае на сходзе нашых пісьменнікаў прывітанне мудраму правадыру, непераўзнаному будаўнічаму новага светлага жыцця тав. Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну, і рад шчыра далучыць свой поспіс да гэтага сардэчнага прывітання.

З нашанай
Акадэмік Беларускай і Украінскай Акадэмій Навук **Я. КУПАЛА.**

Кісловодск, 4 студзеня 1934 года.

ДЗІМІТРАВУ, ТОРГЛЕРУ, ПАПОВУ, ТАНЕВУ ПАГРАЖАЕ ВЯЛІКАЯ НЕБЯСПЕКА

ПАРЫЖ, 16. (БЕЛТА)

Апошнія весткі адносна лёсу чатырох апраўданых лейпцыгскім судом комуністаў маюць усё больш трывожны характар. Газеты апублікавалі сёння тэлеграму з Берліна, што Торглер перавезены з Лейпцыга ў Берлін і перадан у распараджэнне тайнай дзяржаўнай паліцыі, якая знаходзіцца пад кіраўніцтвам Герынга.

Як паведамляе «Інцрэс», яшчэ дакладна невядома, ці сапраўды Торглер дастаўлен у Берлін. Міжнародны камітэт па аказанню дапамогі ахвярам фашызма прадпрымае крокі, каб высветліць, дзе зараз Торглер.

З усёй краіны ў германскае пасольства паступаюць тэлеграмы і рэзалюцыі пратэсту рабочых, студэнцкіх і інтэлігентскіх арганізацый.

ЛОНДАН, 16. (БЕЛТА)

Як паведамляе «Дэйлі уоркер», Дзімітраў сур'ёзна захварэў. Сёння ўвечары ў Лондане арганізуецца дэманстрацыя з мэтай падтрымаць дэпутацыю, пасланую ў германскае пасольства з патрабаваннем неадкладнага вызвалення Дзімітрава і іншых апраўданых на лейпцыгскаму працэсу.

ПАВЕТРАНАЯ КАТАСТРОФА ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 16. (БЕЛТА).

Каля Нэвер (горад на ўсходняй частцы Францыі) буйнейшы і навейшы французскі самалёт «Эмрод» ад раптоўна выбухнуўшага пажару ўпаў з вышыні ў 250 метраў. Пры падзенні ўзарваліся рэзервуары для бензіны. На самалёце знаходзілася 9 чалавек, у тым ліку губернатар Інда-Кітая Паск'е і начальнік французскай грамадзянскай авіяцыі Шам'е. З пад абломкаў самалёта ўдалося выцягнуць 6 трупаў, у тым ліку труп губернатара Інда-Кітая Паск'е. На месца здарэння тэрмінова выехаў міністр авіяцыі П'ер Кот.

***

ПАРЫЖ, 16. (БЕЛТА).

Згодна апошніх даных, пры катастрофе з самалётам «Эмрод» загінула 10 чалавек — уся каманда і пасажыры. Паводле расказаню некаторых сведак, правады радыёантэны самалёта злучыліся з электрычнымі праваданімі высокага напружання пры пералёце праз палатно чыгункі, у сувязі з чым на самалёце ўзнік пажар.

Гібель аднаго з самых лепшых самалётаў французскага паветранага флота зрабіла моцнае ўражанне. На месца катастрофы, апрача міністра авіяцыі, выехаў старшыня авіяцыйнай камісіі палаты дэпутатаў.

У сувязі з катастрофай адзначаюць, што самалёт «Эмрод» устанавіў рад сусветных рэкордаў па хуткасць палёту. Так, адлегласць Парыж — Лондан «Эмрод» пакрываў за 1 гадзіну 7 мінут, Парыж — Марсель за 5 гадзін 31 мінуту. Сярэдняя хуткасць самалёта «Эмрод» пры поўнай нагрузцы дасягала 300 км. у гадзіну. Адлегласці да 2 тыс. км. самалёт з поўнай нагрузкай у 500 кг. пакрываў з сярэдняй хуткасцю ў 256 км. Міністр авіяцыі П'ер Кот зрабіў сваю апошнюю паездку ў Маскву таксама на самалёце «Эмрод».

СТАНОВІШЧА Ў ФУЦЗЯНЕ

ШАНХАЙ, 16. (БЕЛТА).

Як паведамляе Рэйтэр, у Фучжоу спакойна. Усе міністэрствы і асабовы склад фуцзянскага ўрада эвакуіраваліся на поўдзень. Горад патрулюецца маракамі нанкінскага флота. Дакладных вестак аб адступленні 19-й арміі няма. Большасць кітайскага друку ўказвае, што 19-я армія адступіла ў раён Чуанчжоу, дзе будуюцца ўмацаванні для абароны ў выпадку наступлення нанкінскіх войск на поўдзень.

Кантонскія войскі ўступілі ў паўднёвую частку Фуцзяна. Паводле слоў газет, кантонцы не хочуць дапусціць канчатковага разгрому 19-й арміі, а таксама перанясення тэатра ваенных дзеянняў у правінцыю Гуандун.

Як паведамляе Рэйтэр, англійскі крэйсер «Берык» прыбыў у Фучжоу і высадзіў дэсант маракоў. Амерыканскі крэйсер «Тульса» таксама высадзіў дэсант. Японскі дэсант у Фучжоу атрымаў падмацаванні і цяпер налічвае 400 маракоў.

ДЭЛЕГАЦЫЯ ГЕРМАНСКАГА УРАДА У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 16. (БЕЛТА).

Учора ў Варшаву прыбыла дэлегацыя германскага ўрада ў асобе Філіпа і Вегерта для ўдзелу ў канферэнцыі з прадстаўнікамі польскага ўрада па пытанню аб нармалізацыі адносін паміж Польшчай і Германіяй у галіне грамадзянскай авіяцыі.

ПА БССР

МЕНСК ПЕРАД ЛЕНІНСКІМІ ДНЯМІ
НОВЫЯ КНІГІ, ВЫСТАЎКІ

* Акадэмія Навук Беларусі падрыхтавала зборнік навуковых работ, прысвечаных Леніну. Сярод гэтых работ «Ленін і крызіс сучаснага прыродазнаўства»; «Ленін і барацьба з рэлігіяй»; «Ленін і ўсеагульны крызіс капіталізма»; «Практычнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР»; «Ленін і тарфяная справа»; «Ленін і пролетарскі інтэрнацыяналізм».

У інстытутах акадэміі адбудуцца навуковыя даклады аб Леніне і яго ролі ў развіцці розных галін навукі. Навуковыя працаўнікі акадэміі выступяць таксама з дакладамі аб Леніне на прадпрыемствах Менска.

* Да 10-годдзя з дня смерці В. І. Леніна партвыдат БССР выдае рад брашур класікаў марксізма-ленінізма. На працягу бягучага месяца выйдзе з друку 17 брашур Леніна. Сярод іх «Пісьмы здалёку»; «Крах II інтэрнацыянала»; «Аб задачах моладзі»; «Ваенная праграма пролетарскай рэвалюцыі» і інш.

У лютым выйдзе з друку 1 том выбраных твораў Леніна (двухтомніка), падрыхтоўваецца таксама двухтомнік твораў Маркса.

* Беларускі радыёкамітэт 22 студзеня перадасць па радыё новую сімфонію кампазітара Аладава «Сільней смерці», прысвечаную Леніну.

Апроч таго падрыхтаван рад вакальных харавых твораў на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах.

Літаратурна - драматычны аддзел радыёкамітэта ў ленінскія дні рыхтуе літаратурна-музыкальны мантаж «10 год без Леніна», літаратурна-мастацкую перадачу «Ідэем дарогай Ільіча», радыё-п'есу «Пад сцягам Леніна» і літаратурна-музычны плакат «Наш кожны крок па-ленінску разлічан».

* Дзяржаўная бібліятэка арганізуе выстаўку «10 год без Леніна па ленінскаму шляху». Складзен спіс рэкамендацыйнай літаратуры для бібліятэчнай сеткі БССР. Напярэдадні ленінскіх дзён у бібліятэцы будзе давацца кансультацыя для бібліятэчных работнікаў Менска.

35 НОВЫХ МАГАЗІНАЎ

СНК БССР зацвердзіў план паширэння гандлёвай сеткі Белгандлю па асноўных гарадах рэспублікі на 35 адзінак, у тым ліку па Менску 8, Віцебску 7, Гомелю 8, Магілеву 4, Бабруйску 3, Барысаву 2, Оршы 3.

Новыя магазіны будуць спецыялізаванымі з узорнай культурнай абстаноўкай гандлю.

СНК абавязаў старшынь гарсаветаў па працягу дэкаднага тэрміна прадаставіць адпаведныя памяшканні для арганізацыі новых магазінаў Белгандлю.

ПАВЯЛІЧЭННЕ ВЫПУСКУ ГАТОВАГА АДЗЕННЯ І БЯЛІЗНЫ

У бягучым годзе Белшвэйтрэст асаблівы ўпор робіць на паляпшэнне якасці швэйнай прадукцыі і паширэнне асартымента. За першы квартал швэйныя фабрыкі БССР павінны даць прадукцыі на 26.400 тыс. руб. Пашыраецца выраб пальтаў, мужчынскіх і дзіцячых касцюмаў, бялізны і т. д.

Павялічваецца колькасць фасонаў мужчынскага і жаночага гатовага адзення. Замест 6 фасонаў жаночага адзення будзе 11, а мужчынскага замест 1—4.

На тэхнічнае дабаставанне фабрык — устаноўку спецмашын — адпушчана 1.230 тыс. руб.

ЯСЛІ У КАЛГАСАХ І СОЎГАСАХ

Сетка пастаянных і сезонных дзіцячых ясляй у калгасах і соўгасах БССР значна пашыраецца. У гэтым годзе замест 4.531 ясляй будзе ў калгасах 6.100. У соўгасах і на МТС арганізуецца 500 новых пастаянных і сезонных ясляй.

Такім чынам па калгасах, соўгасах і МТС у 1934 годзе яслямі будзе ахоплена 162 тыс. дзяцей.

Для падрыхтоўкі кадраў — спецёр і загадчыц, арганізуецца трохмесячныя курсы на 6.600 чал.

У канцы студзеня райсправамі разам з жаночтамі палітаддзелаў МТС склікаюцца бытавыя канферэнцыі калгасніц па пытанню аб падрыхтоўцы да ясельнай кампаніі ў часе веснавой сяўбы. Першыя канферэнцыі адбудуцца ў Плешчаніцкім, Пухавіцкім, Лепельскім і Уздзенскім раёнах.

Наркамат аховы здароўя БССР выклікаў Заходнюю вобласць на соцспаборніцтва на лепшае правядзенне ясельнай кампаніі ў часе веснавой сяўбы. (БЕЛТА).

ПАЧАУСЯ КАЛГАСНЫ ГАНДАЛЬ ЗБОЖЖАМ

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу).

У адказ на пастанову ЦК ВКП(б) і СНК Саюза аб дазволе калгаснага гандлю хлебам у БССР, перадавыя калгасы раёна арганізуюць чырвоныя абозы са збожжам для продажы каапераціі.

Кааперацыя Рагачоўшчыны ўжо закупіла 15 тон збожжа.

Калгас імя Красіна прадаў дзве тоны. Калгаснік Жаркевіч прадаў каапераціі два цэнтнеры. Калгаснікі с.-г. арцеляй «Правда» і «Ударнік» таксама прадалі два цэнтнеры.

У Ціхініцкую краму завезена першая партыя тавараў для стымулявання збожжазакупак на суму ў 5 тыс. руб. В.

МЕНСК ЗАНОСІЦЦА НА УСЕСАЮЗНУЮ ФІНАНСАВУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

Менск і яго раён датэрмінова — да 20-га снежня — выканаў план мабілізацыі сродкаў насельніцтва па ўсіх плацяжах. Агульны план IV квартала — на 116,2 проц., у тым ліку па добраахвотных плацяжах на 120 проц., па даходах аграмаджанага сектара на 100,4 проц.

За найлепшыя вынікі ў выкананні фінансавага плана IV квартала, і ўсяго 1933 года, СНК БССР прадставіў для занясення на ўсесаюзную чырвоную фінансавую дошку імя XVII з'езда ВКП(б) — Менск і перадавых ударнікаў фінансавага фронту.

ХРОНІКА

* ЗБОРНІК АБ ДРАМАТУРГІІ выпускае Акадэмія навук Беларусі да ўсебеларускага з'езда совецкіх пісьменнікаў. Створана рэдакцыя ў складзе т. т. Гурскага, Александровіча, Коласа і Дунца.

* НОВАЯ ЛАЗНЯ на Серабранцы ў Менску будзе закончана ў сакавіку. Гарсовет абавязаў Менбудвесці будаўніцтва, з такім разлікам, каб у маі лазню можна было пусціць у эксплаатацыю. Адначасова ў бягучым годзе будзе праводзіцца капітальны рамонт і перабастаўванне 1-й і 3-й лазняў.

Завочная партвучоба

Інстытут масавага завочнага навучання пры ЦК КП(б)Б сёння, 17 студзеня, перадае па радыё лекцыю па гісторыі ВКП(б) т. МАНІЛАВА на тэму: СТРАТЭГІЧНЫ ПЛАН І АСНОЎНЫЯ МОМАНТЫ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ТАКТЫКІ Ў РЭВОЛЮЦЫІ 1905-07 ГОДА». Пачатак у 8 гадзін вечара.

„НЕДАРАСЛЬ"

Пастаноўкай «НЕДАРАСЛЬ» Першы беларускі дзяржаўны тэатр паказаў зусім правільную ўстаноўку на крытычнае ўспрыняцце класікі — на выкарыстанне, побач з сучаснымі п'есамі совецкіх драматургаў, лепшых узораў клясічнага рэпертуара як рускага, так і замежнага.

За чатырнаццаць год існавання тэатра гэта спроба з'яўляецца чацвертай на ліку (мяркуючы пад увагу мальераўскіх п'есы «ЖОРЖ ДАНДЭН» і «МЕШЧАНІН ДВАРАНІНАМ» і шылераўскага «СТРАЛКА ТЭЛЯ») і першай — па ступені сапраўднага ажыццяўлення клясічнай спадчыны.

Як справіўся мастацкі кіраўнік тэатра ЛІТВІНАЎ, пастаноўшчык спектакля ДАНІЛАЎ, кампазітар КОЎНЕР, мастак ТОЎБІН, як справіўся ўвесь калектыў БДТ-І з мастацкай інтэрпрэтацыяй фанвізінскага тэксту?

Першай і асноўнай дадатнай якасцю гэтага спектакля трэба прызнаць цвёрдае імкненне рэжысуры выкрыць і паказаць сацыяльны характар выведзеных Фанвізіным персанажаў, сарваць усе і ўсялякія маскі з прадстаўнікоў кіруючага класа эпохі Екацерыны II.

З'яўляючыся сам прадстаўніком класа памешчыкаў Фанвізін не мог, зразумела, пры ўсёй вострасці сваёй сатыры, правільна адлюстраваць таўчасная становішча.

Але, як безумоўна буйны мастак, Фанвізін знайшоў у аказаючай яго рэчаіснасці такія рысы, абмінуць якія было немагчыма, і дзякуючы во стра сатырычнаму паказу якіх яго камедыя асталася неўмаручай на працягу стагоддзяў.

Адпэтуль стаўка тэатра на развянчанне традыцыйна-станоўчых вобразаў п'есы — МІЛОНА, СОФІ, ПРАЎДЗІНА. Зразумела, выходзячы з класавай абмежаванасці аўтара, задача, пастаўленая тэатрам (максімальна поўны паказ эпохі ва ўсіх яе супярэчнасцях) не магла-б атрымаць належнага вырашэння без прыцягнення дадатковага, пашыраючага тэму матэрыяла. І ў гэтай пастаноўцы апрача «НЕДАРАСЛЯ» ёсць і «ВЫБАР ГУВЕРНЁРА», і лісты Фанвізіна, і дапаможныя, зусім панава ўведзеныя мізансцены.

З прычыны частковых змен тэксту прыйшлося скампанаваць спектакль замест клясічных пяці дзеяў — у некалькіх карцінах, зведзеных у тры, досыць працяглых дзеі.

Такім чынам, асталася галоўная сюжэтная лінія: 16-гадовы дваранскі недарасль — Мітрафан, воляй маткі — Прастаковай — павінен ажаніцца на багатай нявесце («дзесяць тысяч»!) — Софі. У якасці «жаніха» выступае яшчэ брат Прастаковай — Скацініін.

Але Софі любіць афіцэра Мілона і з дапамогай рэзанёраў — вельможы Праўдзіна і свайго дзядзькі Старадума шчасліва вырываецца з рук нядбалых прэтэндэнтаў.

Да гэтага дадаць, у інтэрмедыйным плане, ода прыдворных у гонар імператрыцы, перад яе партрэтам (на авансцэне) — і як супярэчнасць — сумная песня прыгонных, пасля адкрыцця заслоны. Дадана сцена, паказваючая адносіны Софі да дваіных, шмат чаго дадана ў трэцяй дзеі (новы і сам фінал).

Пераходзячы да паасобных тыпаў, выведзеных у камедыі, хочацца спынніцца, перш за ўсё, на тых, якіх та ловаму трактуе БДТ-І. Возьмем СОФІЮ (арт. ЖДАНОВІЧ). Тэатр, на нашу думку, правільна трактуе яе, як Прастакову ў маладосці. Такому ўзняццю спрыяюць і сцена з перапранаваннем (біцце дзяўчыны—прыслужніцы), адносіны да Мілона (раскрыццё ханжаства, паказной «галубінай чыстаты»), і падрыхтоўка да спаткання Старадума, дзе Соф'я разам з другімі блазітасна такіе да ўпаду дваровых сялян. У іграх адпаведнай артысткі Жданові́ч адчуваецца надзвычайная непасрэднасць, жывасць і разуменне іменна такога аспекту ролі хоць, часамі, і адчуваецца праазмерная шаржыроўка.

МІЛОН паказан таксама «сапраўдным», грубым і жорсткім (спана «навучаны» Івана), а не кволым і чулым, «обаятельным» героем-любоўнікам, як паказвалі яго справдешку. Та та — будучы палкоўнік Скалазуб з «Горя от ума» Грыбаедава. Ролю Мілона, значна больш складаную і цяжэйшую ў такім плане, вельмі вытрымана, да скульптурнасці чотка і адшліфавана, вядзе заслужаны артыст рэспублікі ВЛАДАМІРСКІ.

Добра вядзе ролю ПРАЎДЗІНА артыст БІРЫЛО. Праўдзін належным чынам рэвізван рэжысёрам і актёрам, і падан як бюракрат-хабарнік, вяльможа, які за гучнымі словамі аб свавольстве і гнуснасці гвалту нах слабейшымі хавае па сутнасці прадажнае і пустое нутро. Пра гэта сведчыць канцоўка, калі скрынка з золатам пераважае, і Праўдзін вядзе прастаковай указ аб аддаванні яе суду і канфіскацыі маёмтка.

Найменш удалася тэатру вобраз СТАРАДУМА (арт. КРЫНІЦА). Гэты будучы «Тіт Тітыч» Астроўскага, абіральны тып «приобретателя» — тоўстасума не выяўлен за ўсёй паўнаце, як асоба, характэрная ўжо для екацерынінскіх часоў. Мажліва, што тут віною брак слоўнага матэрыяла ў самой п'есе — і на дапрацоўку тэатра вобразу пастаноўшчыкам трэба звярнуць асаблівую ўвагу.

З іншых персанажаў, паказаных больш-менш у традыцыйных гэтак запамінаюцца СКАЦІНІН (ГЛЕБАЎ), ЦЫФІРКІН (КРАЎЦОЎ). Моцна тэатральна праяла сваю роль (Прастаковай) РЖЭЦКАЯ.

Мастацкае афарбленне спектакля (мастак — тав. ТОЎБІН, запрошаны з тэатра «БЕРЭЗІЛЬ») адпавядае агульнай мэтаімкнёнасці калектыва, паказу рэзкага кантрасту паміж вярхушкай — прывілеяваным дваранствам і нізамі — прыгоннымі сялянамі. Грубыя талоны панскіх харомаў (зусім зразумелая і глушы правінцыі мешчаніна «французскага з ніжагародскім») пакоящца на жабрачых стрэхах двораў... Некалькі залішне толькі праўдзяецца ў тав. Тоўбіна стаўка на «всамделишность», натуральнасць, якая прыводзіць момантамі да натрамаджэння і грубай фетышызацыі рэчаў.

Музыкальнае суправаджэнне тав. КОЎНЕРА не вызначаецца арыгінальнасцю і нават дастаткова ўзяй з'агульным кантэкстам «Недарасля». Добра толькі тое, што кампазітар заўважыў асаблівасці пабудовы трэцяга акта (бал у Прастаковых) і нацмысліл крыху «русіфікаваў» менуэт і мазурку. Бо ясна, што высокага клясічнага выканання танца, як і клясічнай музыкі, у мастаках Прастаковых і Скацініных не магло быць.

Агульнае ўражанне ад «Недарасля» ў пастаноўцы БДТ-І астаецца моцнае і светлае. Спектакль даходзіць да нашага гледача, разгортваючы перад ім у плане высокай камедыі-сатыры адну з самых цмяных старонак гісторыі царскай, самаўладнай Расіі.

Загана тут хіба ў занадта яркім гратаску, у досыць трубаватай шаржыроўцы адмоўных рысаў герояў. Навошта, напрыклад, пакідаць у гледачоў уяўленне пра ўсіх прыгонікаў, як пра суцэльных ідыётаў?

Але, паўтараем, спектакль вышаў жывы і цікавы! Пастаноўка «Недарасля»—буйны поспех тэатра.

ЮР. ЛЯБОННЫ.
ЮР. ТАКАРЧУК.

Паведамлення

Культпрося ЦК КП(б)Б склікае 17 студзеня 1934 г., а 10 гадз. вечара ў габінеце тав. Тамаркіна нараду аб пастаноўцы выкладання гісторыі ВКП(б) і КП(б)Б у завочнай сістэме. На нарадзе зробіць даклад прадстаўнік ІМЭЛ і ІМЗО тав. Маніловаў.

Яўка абавязкова для наступных таварышоў: Мінкі, Пасее С., Немец, Мацэль, Клімаў, Палонскі, Дыркстаренко, Малаковіч, Потапі, Мееровіч, Мацвейчык, Станкевіч, Шчарбакоў, Нісенбаум (ЦКК), Горын П., Кантаровіч, Воранава, Агурскі, Гурэвіч Ц., Кагап (Гістпарт), Арабей, Савіч, Рамапчук, Трус, Карабейчык, (Наркамасветы), Кулінковіч, Арановіч.

Загадчык культпропа ЦК КП(б)Б Тамаркін.

***

19 студзеня ў 10 гадзін раніцы ў г. Менску (Дом Урада, правае крыло, 2-гі паверх, пакой № 266) будзе засядаць Рэспубліканская камісія па чысткі па разгляду апеляцый на пастановы менскай гар. камісіі наступных таварышоў:

Зяньковіч Е. І. (пазт'ячэйка працасветы), Зялінскі С. А. (парт'ячэйка Лесбела), Шапіра Р. Э. (яч. Белгандля), Хейфец С. А. і Калінін М. С. (парт'ячэйка Белкаапсаюза), Якерсон Ф. М. (яч. ВКОГШБ), Рысь П. Ф. (яч. хімтэхфакультэта), Калтуноў Н. Д. (яч. ДПУ), Рулкоўская М. С. (яч. Чырвонага крыжа), Качноўскі С. Л. (Браніцкі раён), Куксо Н. М. (Слуцк, ДПУ), Богамолаў Д. С. (Асіповіцкі раён), Клімкоў В. Р. (Гомель), Кажушко А. А. (ДПУ), Скуратовіч С. К. (яч. службы шляху), Корнева Н. І. (яч. трамвайнага), Буйко Ю. С. (яч. БДУ), Шафран Я. Д. (Лепельскі раён), Капіроўская С. М. (ячэйка фабрыкі «Окцябр»), Нахамкін Д. І. (яч. цагельні № 1), Кізіла В. Т. (парткалектыў фабрыкі «Окцябр»), Барысаў М. А. (яч. трамвайнага), Залкінд Н. Е. (парткалектыў завода «Комунар»), Гіцэвіч А. І. (парткалектыў службы шляху), Левінсон А. М. (парткалектыў завода «Большэвік»), Ерменка З. Н. (Гомель), Рахманаў П. М. (Віцебск), Фельдман І. Н. (парткалектыў друкарні імя Сталіна), Трэшчанок М. А. (ячэйка Наркамзема), Блюмкін Б. С. (яч. БКС), Варанчук Ш. І. (яч. Скурснаб збыта), Доўнар І. І. (парткалектыў завода імя Варашылава), Спевак М. М. (парткалектыў ВКСГШБ), Азернаў М. Е. (яч. ЦЭЦ), Авілін П. І. (яч. Саюзмаслапрама), Тропаў Г. А. (яч. ВЭО), Іваноў Г. А. (яч. медінстытута), Данільчык С. (як. Наргасучота), Розава Ю. М. (ПП АДПУ), Касценка А. І. (ПП АДПУ), Слабодчык С. П., Файн З. Л. і Чэрвінскі Л. Л. (яч. медінстытута), Дуброўскі П. П. (яч. тэатральных установаў), Аванін І. Ф., Якутовіч І. І., Гурскі А. І. (ПП АДПУ), Булкевіч С. А. (Горацкі раён), Шоламіцкі А. Ф. (ячэйка Упраў нарком. замеж. гандлю), Емчанка А. К., Лашко А. Н. (яч. ЦОПОБ), Самсін П. В. (яч. НДІ прамысловасці), Аванін Ф. М. (яч. рэдакцыі «Калгаснік Беларусі»), Вольдэнберт Э. Я. (яч. Наркамвнема), Левіна Л. С. (Барысаўскі раён), Дзержынская Г. Л. (яч. працасветы), Дубінская А. А. (яч. рэдакцыі «Звязда»), Свойскі А. І. (яч. СНК).

Выключаюцца старшыні праверкомаў памянёных парткалгаізацый.

Рэспубліканская камісія па чысткі.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ВЫДАВЕЦТВА

Да XV з'езда КП(б)Б
ВЫШЛІ З ДРУКУ
ПРАВАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ.
Тыраж 100.000, цана 50 кап.
«Пісьменнікі БССР АБ рэформе правапіса беларускай мовы». Тыраж 2.000, цана 1 руб.
Філасофскі зборнік. Тыраж 1.000, цана 2 р. 25 к.
КНІГІ ПРАДАЮЦЦА ва ўсіх кнігарнях Дзяржвыдбела, БАКТ'а і райспажыўсаюзаў ва ўсіх гарадах і раёнах БССР.

БДТ-І Першы Дзярж. тэатр
Сёння, 17 студзеня
ФАНВІЗІН.
НЕДАРАСЛЬ
Пачатак ровно ў 8 гадзін.
Спазнішыяся да бліжэйшага антракта у зал дапушчаны не будуць.
Здымаць палітэ, галошы, боты, галёўныя ўборы—абавязкова.

ГУКАВЫ КІНО ТЭАТР
„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
СЁННЯ і штодзённа
НОВЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ
„ДВОЙЧЫ НАРОДЖАНЫ"
У ПРАГРАМЕ—
РАПАРТ БЕЛДЗЯРЖКІНО
XV З'ЕЗДУ КП(б)Б.
ГУКАВЫ фільм у 3-х частках.
ШТОДЗЁННА 4 СЕАНСЫ.
ПАЧАТАК 6, 7-30, 9, 10-30.

КІНО Інтэрнацыянал — Совецкі мастацкі фільм ПУРГА
Дзіцячы гукавы кіно тэатр — ПРЫГОДЫ АНЫШКІ (Прыгоды Мацёны) У праграме—гукавая хроніка
КІНО Пролетарый Касса з 4 г. — Мастацкі кінэ-раман УКРАЇНА (БАГЛЕЙ) 2-я аповешка сёння ў 10 ч.
КІНО СПАРТАК — Выдатны мастацкі фільм. ТАЙНА МАЯКА драма ў 7 частках.

ДА ВЕДАМА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ
КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ЗАМАЦОЎВАЕ ЗА ПРАДПРЫЕМСТВАМІ
СТАЛЫЯ МЕСЦЫ ДЛЯ УДАРНІКАЎ
Заяўкі і ўмовы ў канторы кіно-тэатра і па тэлефону 21—145 ад 6 да 11 гадз. вечара.

ЗАВОЧНАЯ ПАРТВУЧОБА
Інстытут масавага завочнага навучання партактыва перадае праз Менскую радыёстанцыю на хвалі 1442 метр. радыёлекцыі:
17 —Гісторыя ВКП(б) (вучэбная лекцыя) —„Стратэгічны план і асноўныя пытанні большэвіцкай тактыкі ў рэволюцыі 1905-1907 г. г".
20 —„ЛЕНІН І СТАЛІН пра другі тур рэволюцый і войн". (К 10 годдзю з дня смерці В. І. ЛЕНІНА).
ІМЗО пры ЦК КП(б)Б.

Беларускі дзяржаўны тэатр рабочай моладзі
абвяшчае прыём
у аператорскі склад.
Прымаецца моладзь ад 18 да 24 год.
Тэрмін падачы заяўкі дакументаў да 28 студзеня 34 г. Іспытанні 1 і 2 лютага г. г. з 10 гадз. раніцы.
Заявы дасылаць: г. Менск, Комсамольская вул., клуб імя Сталіна.
За даведкамі звяртацца з 12 да 2 дня і ад 6 да 8 веч.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
„ПАРТВЫДАТ"
ЛІТАРАТУРА
ДА 10-й ГАДАВІНЫ СМЕРЦІ В. І. ЛЕНІНА
ВЫШЛІ З ДРУКУ і паступілі ў продаж
ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ В. І. ЛЕНІНА.
ЛЕНІН В. І.—Аграрная праграма рускай социял-дэмакратыі. Выд. 1933 г., тыр. 10 тыс., ц. 25 к.
ЛЕНІН В. І. Ад якой спадчыны мы адмаўляемся. Выд. 1933 г., тыр. 10 тыс., ц. 30 к.
ЛЕНІН В. І.—Да вясковай беднаты (аб'яснение да сялян, чаго хочуць социял-дэмакраты). Выд. 1933 г., тыр. 10 т. ц. 40 к.
ЛЕНІН В. І.—Пагражаючая катастрофа і як з ёю змагацца. Выд. 2-е. 1933 г., тыр. 10 т., ц. 30 к.
ЛЕНІН В. І.—Пісьмы аб тактыцы з дадаткам „Аб задачах пролетарыята ў даную рэволюцыю". Выд. 2-е 1933 г., тыр. 10 тыс., ц. 20 к.
ЛЕНІН В. І.—Поспехі і труднасці Совецкай улады. Выд. 2-е 1933 г., тыр. 10 т., ц. 25 к.
ЛЕНІН В. І.—Прамовы ў гадавіну Кастрычніка. Выд. 2-е 1933 г., тыр. 15 тыс., ц. 40 к.
ЛЕНІН В. І.—Фрыдрых Энгельс. Выд. 1933 г., тыр. 12 тыс., ц. 15 к.
ЛЕНІН В. І.—Ці ўтрымаюць большэвікі дзяржаўную ўладу. Выд. 2-е 1933 г., тыр. 15 тыс., ц. 25 к.
ЛЕНІН В. І.—Пратест расійскіх социял-дэмакратаў. Тыр. 6 тыс., ц. 15 к.
ЛЕНІН В. І.—Социялізм і вайна. Выд. 1933 г., тыр. 8 тыс., ц. 35 к.
ЛЕНІН В. І.—Урокі рэволюцыі. Выд. 2-е 1933 г., тыр. 10 т., ц. 15 к.
ЛЕНІН В. І.—Чарговыя задачы Совецкай улады. Выд. 2-е 1933 г., тыр. 10 т., ц. 30 к.
ЛЕНІН В. І.—Аб рабоце ў вёсцы. Выд. 1933г., тыр. 15 тыс., ц. 25 к.
ЛЕНІН В. І.—Социялістычная рэволюцыя і права нацыі на самавызначэнне. Выд. 2-е 1933 г., тыр. 10 тыс., ц. 15 к.
ЛЕНІН В. І.—Задачы пролетарыята ў нашай рэволюцыі. Выд. 1933 г., тыр. 10 тыс., ц 25 к.
ЛЕНІН В. І.—Маркс- Энгельс —Марксізм. Выд. 1933 г., тыр. 6 тыс., ц. 2 р. 40 к. (у пераплёце).
ЛЕНІН В. І.—Расказ аб II з'ездзе РС-ДРП (на яўр. мове). Выд. 1933 г., тыр. 3 т., ц. 20 к.
АБ ЛЕНІНЕ.—Даклад аб рэволюцыі 1905 г. (на яўр. мове). Выд. 1934 г., тыр. 3 тыс., ц. 25 к.
СТАЛІН—Аб Леніне. Выд. 1933 г., тыр. 20 тыс., ц. 25 к. (на бел. і яўр. мовах).
СТАЛІН.—Аб асновах ленінізма. Выд. 1933 г., тыр. 35 т., ц. 50 к., пер. 30 к.
СТАЛІН.—Дадатак да „Пытанні ленінізма". Выд. 1933 г., тыр. 40 тыс. ц. 50 к., пер. 30 к.
КРУПСКАЯ.—Ленін як прапагандыст і агітатар. Выд. 1933 г., тыр. 8 тыс., ц. 15 к.
ГОРКІ.—В. І. Ленін. Выд. 1933 г., тыр. 6 тыс., ц. 40 к., пер. 45 к.
ЛЕПЕШЫНСКІ.— Як узнікла ленінская партыя. Выд. 1933 г., тыр. 10 тыс., ц. 1 р.
ЛЕПЕШЫНСКІ.— Як узнікла ленінская партыя (на яўр. мове). Выд. 1933 г., тыр. 2 т., ц. 1 р.
ГАРБУНОЎ.—Як працаваў Ленін (на яўр. мове). Выд. 1933 г., тыр. 3 тыс., ц. 45 к.
АНІКСТ.—Успаміны аб Леніне. Выд. 1933 г., тыр. 4 тыс. ц. 30 к. (на бел. і яўр. мовах).
ЛЕНІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА, ЯКАЯ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ДРУКУ і ВЫХОДЗІЦЬ ГЭТЫМІ ДНЯМІ
ЛЕНІН В. І.—Пісьмы здалёку. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Што рабіць. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Аб школе і комуністычным выхаванні моладзі. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Аб задачах моладзі.
ЛЕНІН В. І.—Аб дзяржаве. Тыр. 10 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Аб левым дзяцінстве і аб дробна-буржуазнасці. Тыр. 10 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Аб брашуры Юніус. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Крах II гэта інтэрнацыянала. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН і МОЛАДЗЬ. Тыр. 15 т.
ЛЕНІН В. І.—Аб нацыянальнай гордасці велікарусаў. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Даклад аб рэволюцыі 1905 г. Тыр. 20 тыс.
ЛЕНІН В. І. і СТАЛІН. — Аб социялістычным спаборніцтве. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Ваенная праграма і пролетарская рэволюцыя. (Аб лозунгу разбраення). Тыр. 20 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Эканоміка і палітыка ў эпоху дыктатуры пролетарыята. Тыр. 20 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Тэзісы аб асноўных задачах II кангрэса комінтэрна. Тыр. 15 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Аб праве нацый на самавызначэнне. Тыр. 25 тыс.
ЛЕНІН В. І.—Аб прадавольственным падатку. Тыр. 20 тыс.
СЕМАШКО.—Успаміны аб Леніне (на бел. і яўр. мовах).
Пералічаную літаратуру патрабуйце ва ўсіх філіялах і кнігарнях Дзяржвыдбела, райсаюзаў, БАКТ'а і ў магазіне партвыдата—Совецкая, 61.

Дырэкцыя і камсод
ВЫШЭЙШАЙ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАЛГАСНАЙ ШКОЛЫ БССР
(м. Копысь. Аршанскі раён.
Даводзіць да ведама б. слухачоў школы, падпісаўшыхся на пазыку
«4-ы ЗАВЯРШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ»,
што усякія прэтэнзіі ў адносінах выплэй паказанай пазыкі атрымання будуць прымацца да да 1 лютага 1934 года.
Пасля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць і абліга цыі будуць перададзены у ашчадкасу.
Дырэкцыя і камсод.

Польскі педагагічны тэхнікум імя Весялоўскага ў Менску
абвяшчае прыём на васьмімесячныя настаўніцкія курсы, якія адкрываюцца 20 студзеня 1934 года.
На курсы прымаюцца дзеці рабочых, калгаснікаў і веднякоў аднаасобнікаў, якія скончылі сямігодку, або 6 груп сямігодкі, ва ўзросце не менш 16 год.
Для паступлення патрэбна прадставіць наступныя дакумэнты: метрыку, пасведчанне аб асвеце, аб соцстановішчы, аб стане здароўя.
Прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і сталоўкай.